Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№156 (28520)

16 жніўня 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Як развіваецца сфера малога бізнесу

МС

Што прапануе школьны буфет

СТАР. 2

Усё пра шкоду і карысць раслін

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл КАВАЛЁЎ, дэкан эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта:

«Беларусь — маленькая краіна, але ўсе ведаюць, што ў сусветным экспарце, сусветнай вытворчасці мы лідзіруем па вельмі многіх пазіцыях. Напрыклад, па лёне мы трэція ў свеце. Зусім нядаўна прыйшла інфармацыя ад Сусветнай гандлёвай арганізацыі, што адносна малака Беларусь выйшла на пятае месца ў свеце і трымае 4% сусветнага рынку. Зразумела, што наперадзе Новая Зеландыя, гіганцкі ЕС, ЗША, Аўстралія, але пятай ідзе наша краіна. І гэтым кожны з нас павінен ганарыцца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.08.2017 г.

Долар ЗША	1,9498	▲
Еўра	2,2907	▼
Рас. руб.	0,0325	▲
Укр. грыўня	0,0761	▲

ISSN 1990 - 763X

ЗБОЖЖА БЛАСЛАВЁНАЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Удзельніцы фальклорнага гурта «Вязанка» з вёскі Вяззе Асіповіцкага раёна Вольга САЛАЎЁВА, Рэната ПАРАМОНАВА, Алена БЕЛАХВОСТ, Марына ЛЕЙВА і Ірына ЗАБАЎСКАЯ (з абразом).

Дзеці ў цэнтры ўвагі

Летнія канікулы адлічваюць апошнія дзянькі. Зусім хутка сотні тысяч беларускіх школьнікаў перамесцяцца за школьныя парты. Менавіта з гэтай нагоды ратавальнікі праводзяць акцыю «У цэнтры ўвагі — дзеці». А расказаць аб тым, што чакае маленькіх беларусаў і іх бацькоў, карэспандэнт «Звязды» папрасіў афіцыйнага прадстаўніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Вольгу МЕЛЬЧАНКУ.

Сёлета акцыя пройдзе ўжо пяты раз. Яна падзелена на тры этапы. Першы з іх пачнецца зусім хутка — 21 жніўня.

Экіпіроўка ратавальнікаў побач з формай

Падрыхтоўка да школы рэдка абыходзіцца без візіту ў буйны гандлёвы цэнтр. Столькі ўсяго трэба набыць — і канцылярскія прылады, і форму, і абутак, і заплечнік... Зразумела, што рабіць пакупкі зручней у адным месцы, чым ездзіць па вялікім горадзе. На гэта і зробяць акцэнт ратавальнікі. Тым больш што вельмі многа бацькоў адкладаюць падрыхтоўку да школы на апошнія дні лета...

— Напрыклад, у аддзелах дзіцячага адзення на манекенах або вешалках будуць выстаўлены камплекты баявога адзення ратавальніка, — кажа Вольга Мельчанка. — Сярод іх — і экіпіроўка дзіцячых памераў. А ў аддзелах, якія гандлююць канцылярскай прадукцыяй, з'явяцца вогнетушыцелі і аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Уся атрыбутыка суправаджаецца цэтлікамі, на якія нанесены адпаведныя слоганы.

СТАР. 3

■ Жніво-2017

ПЕРАВАГІ АЙЧЫННАЙ СЕЛЕКЦЫІ

Навукоўцы падзяліліся апошнімі дасягненнямі ў аграпрамысловасці

Беларускім вучоным у сферы развіцця сельскай гаспадаркі штогод даводзіцца адказваць на вялікую колькасць выклікаў, каб наша краіна мела магчымасць прадаваць высакаякасную плодаагароднінную і мяса-малочную прадукцыю на рынках іншых дзяржаў.

Неабходна і новыя сарты раслін вывесці з большай ураджайнасцю, і распрацаваць рэцэптуру кармоў для жывёлагадоўлі, і пабудаваць машыны, якія будуць забяспечваць догляд за раслінамі як на этапе развіцця, так і ў момант іх уборкі. І «папраўку» на надвор'е зрабіць не забыцца. А таксама трэба сачыць за перадавымі сусветнымі распрацоўкамі і калі не апярэджваць іх, то як мінімум, не адставаць і ісці ў нагу з часам. Пра тое, над чым яны сёння працуюць, больш падрабязна ў матэрыяле «Звязды».

Ў РЭЖЫМЕ НОН-СТОП

Апошнія 10 гадоў у Беларусі назіраецца тэндэнцыя павелічэння ўраджайнасці і валавога збору збожжа. Яшчэ дзесяцігоддзе таму мы збіралі каля 5 млн тон у сезон. Сёлета планка паднятая амаль да 8 млн тон. Навукоўцы добра падрыхтаваліся для дасягнення мэты —распрацавалі сарты і тэхналогіі, угнаенні і сродкі аховы раслін. Пры гэтым яны не хварэюць на аптымізм, і робяць «папраўку на глупства». Яны разумеюць, што на месцах не заўсёды ўносяцца ўгнаенні ў тых колькасцях, якія рэкамендуюцца тэхналагічным рэгламентам. Улічваюць і тое, што не заўсёды праводзіцца своечасова абарона раслін і не тымі прэпаратамі. Па іх разліках, калі тэхналогіі ўсіх этапаў будуць выконвацца, атрымаць ураджайнасць у 45 цэнтнераў з гектара — цалкам рэальна.

Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і вытворчасці Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ адзначае, што кожны новы сорт, які ствараюць айчынныя навукоўцы, эфектыўнейшы на 3-5% за папярэдні аналаг. Штогод іх ствараецца ад 15 да 28. Нягледзячы на тое, што з беларускімі селекцыянерамі канкуруюць лепшыя еўрапейскія селекцыйныя цэнтры, на нашых палях усё яшчэ каля 80% айчынных сартоў. «А гэта больш за 2 млн гектараў раллі», — удакладняе **Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН па земляробстве Эрома УРБАН**.

СТАР. 4

ПРАДУМАНАЯ СТРАТЭГІЯ

У Палацы Незалежнасці абмеркавалі развіццё сістэмы адукацыі

Ход уступнай кампаніі, гатоўнасць да новага навучальнага года ўстаноў адукацыі, абнаўленне вучэбных праграм і падручнікаў, школьныя базары і прапановы па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу... Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладамі намесніка прэм'ер-міністра Васіля Жарко і міністра адукацыі Ігара Карпенку.

Новыя падручнікі і праграмы

Уступная кампанія заканчваецца 20 жніўня. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся яе ходам:

— Мне хацелася б даведацца ў гэтым плане асноўнае: як канчаткова будзем карэкціраваць правілы прыёму. Такая задача была пастаўлена ўсім, хто кантраляваў ход уступнай кампаніі. Як мы дапрацуем, зменім або вернемся можа недзе да старога? Шмат часу прайшло, на працягу якога мы апрабавалі розныя падыходы. На чым спынімся? Гэта галоўнае пытанне.

Другое пытанне, не менш важнае на думку Прэзідэнта, — гатоўнасць да навучальнага года навучальных устаноў. Аляксандр Лукашэнка спытаў, ці ёсць тут праблемы?

— У гэтым плане пытанне таксама першаступеннай важнасці — абнаўленне вучэбных праграм і падручнікаў, — упэўнены кіраўнік краіны. — Мы ж не наноў ствараем падручнікі, мы не наноў ствараем навучальныя праграмы. У асноўным гэта нармальныя навучальныя праграмы.

У той жа час ёсць моманты, якія трэба дапрацаваць, скарэкціраваць:

— Вы ведаеце мае падыходы, ды і ў вас яны такія ж. Вы нават больш глыбока пагружаны ў гэтую праблему. Таму трэба хутка адкарэкціраваць як мы і намецілі: у 2018 годзе ў асноўным скончыць выданне новых падручнікаў і асабліва праграм. Дапрацаваць. Я праблем не бачу, таму што па кожным падручніку можна стварыць групу. Нават па вертыкалі: ад пятага класа і да адзінаццатага прывядуць у парадак падручнікі — і з вялікім задавальненнем. Да гэтага патрэбна прыцягнуць больш практыкаў, а не акадэмікаў. Ну і ад акадэмікаў адмаўляцца нельга, таму што гэта людзі, якія знаходзяцца на вяршыні ведаў, калі можна так вобразна сказаць. Таму падручнікі — гэта вельмі важна.

Усе дзеці роўныя

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на сацыяльны бок падрыхтоўкі да новага навучальнага года. Шматдзетныя сем'і, дзеці-сіроты, дзеці з малазабяспечаных сем'яў не павінны адчуваць ніякіх праблем у матэрыяльным плане. Пра гэта дзяржава павінна паклапаціцца абавязкова.

— Ну і мерапрыемствы — кароткая, якія праходзяць да пачатку навучальнага года, — абазначыў Прэзідэнт. — Мы заўсёды вельмі добра праводзілі школьныя базары, апраналі, абувалі, прадавалі школьныя прылады. І ў гэтай частцы: як у нас справы з беднымі сем'ямі, асабліва шматдзетнымі, сем'ямі, што выхоўваюць сірот, сірот у нас, на жаль, нямала... Як тут? Мы заўсёды вельмі годна праводзілі гэта. Формула адна, я яе яшчэ раз паўтару: каб першага верасня дзеці былі аднолькавыя. Не ў тым плане, што яны павінны быць апрануты ў чорна-белае... Каб не выбіваліся дзеці з сем'яў, якія не так багатыя сёння. Мы павінны апрануць годна да першага верасня ўсіх дзетак, каб яны маглі пайсці ў школу.

Мінімум фармальнасцяў

У хуткім часе ў нас пройдзе вялікае мерапрыемства ў галіне адукацыі: рэспубліканскі педагагічны савет, у якім плануе прыняць удзел і кіраўнік краіны.

— Мы павінны яго правесці на належным узроўні, — выказаў пажаданне Аляксандр Лукашэнка. — На падобных педагагічных саветах Прэзідэнт даўно не бываў. Настаў час, ды і ёсць што сказаць педагагічнай супольнасці ў плане і новых умоў, і новых праграм, паступлення, усіх пытанняў, якія мы будзем абмяркоўваць. Ну і параіцца з педагогамі. Яны ўсё-такі нам падкажуць — гэта наша апора, нашы людзі. І мне вельмі важна пабываць на падобным педсавеце. Трэба зрабіць яго незафармалізаваным, зрабіць на годным узроўні, каб мы маглі пагаварыць, вычленіць тыя праблемы, якія нам трэба будзе вырашаць.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

❍ У тэму

ЦІ БУДЗЕМ ЗНОЎ ВУЧЫЦЦА «НА ПЯЦЬ»?

Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра, старшыня дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэднеспецыяльнай адукацыі ў 2017 годзе, расказаў журналістам, што ўжо можна казаць пра пэўныя вынікі сёлетняй уступнай кампаніі. Па яго словах, сёлета вынікі тэстаў працэнтаў на 10-15 лепшыя, чым летась.

— Гэта сведчыць пра тое, што мы ўжо сёлета пачалі пераглядаць адпаведнасць тэстаў школьнай праграме, — заўважыў віцэ-прэм'ер. — Гэта работа будзе працягнута. Прэзідэнт даў такое даручэнне: да наступнай уступнай кампаніі ўсе тэсты павінны быць перагледжаны і выразна адпавядаць вучэбнай праграме сярэдніх школ.

Падчас размовы з Прэзідэнтам, як паведаміў Васіль Жарко, у тым ліку абмяркоўвалі завочнае навучанне:

— Дзяржаўная камісія ўнесла прапанову, што завочнае навучанне ў асноўным павінна быць платным. Для выпускнікоў сярэдніх школ — толькі праз год, за які яны павінны атрымаць стаж працы. Па некаторых жа спецыяльнасцях завочнае навучанне можа быць таксама на бюджэтнай форме.

Закраналася тэма дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў.

— Шмат пытанняў стаіць па дзесяцібальнай сістэме, — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра. — Часам бывае суб'ектывізм у адзнацы. У нас няма нездавальняючай адзнакі, бо адзін бал — гэта таксама адзнака. Таму трэба вынесці на абмеркаванне грамадскасці і, магчыма, вярнуцца да пяцібальнай сістэмы.

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі, расказваючы пра падрыхтоўку да новага навучальнага года, паведаміў:

— Да першага верасня мы выпусцім каля 30 новых падручнікаў. Яшчэ частка будзе надрукавана да канца года — каля 11 падручнікаў. У цэлым задача пастаўлена: да канца 2019 года цалкам абнавіць усю лінейку падручнікаў па агульнай сярэдняй адукацыі.

Што да падрыхтоўкі да школы дзетак з сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва, шматдзетных сем'яў, дзяцей-сірот, то на гэта, праінфармаваў міністр, па Праграме дэмаграфічнай бяспекі выдзелена 6,6 мільёна рублёў.

■ Будзь у курсе

ШКОЛЬНЫ БУФЕТ — ЗОНА ЗДАРОЎЯ

Галоўнае адукацыйнае ведамства і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю вырашылі ўсур'ёз узяцца за здароўе школьнікаў. У чэрвені адбылася сумесная калегія чатырох міністэрстваў, на якой сярод іншых аспектаў, ад якіх залежыць самаадчуванне нашых дзяцей, згадваліся і нездаровыя харчовыя звычкі. Вынікам сталі распрацаваныя метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі.

Згодна з метадычнымі рэкамендацыямі каўбасы і сасіскі вараныя найвышэйшага і першага гатункаў могуць прапаноўвацца школьнікам не больш за адзін раз на тыдзень пры аднаразовым прыёме ежы. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі дазваляюцца толькі каўбасы і вараныя сасіскі найвышэйшага гатунку або з маркіроўкай "Для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту", але таксама не часцей за адзін раз на тыдзень. Піца, смажні і сасіскі ў цесце будуць прадаваць таксама не больш за два разы на тыдзень.

У асартыменце павінны прысутнічаць сокі, фруктовыя або пладовыя нектары, агароднінныя, малочныя, кісламалочныя прадукты, у тым ліку ўзбагачаныя мікранутрыентамі. Рэкамендуецца таксама продаж гематагену, мармеладу і зефіру. А вось асартымент цукерак, шакаладных батончыкаў, карамелі, пячэння абмяжуюць.

Мэтазгодным з'яўляецца ўкараненне сучасных тэхналогій прыгатавання ежы, а таксама папярэдні заказ страў па меню заўтрашняга дня, абслугоўванне па тыпе шведскага стала, арганізацыя работы буфетаў, кафэ і інш.

Асобная ўвага ўдзяляецца зніжэнню кошту харчавання: наладжванню прамых сувязяў з вытворцамі, развіццю ўласнай нарыхтоўчай базы. А вось закупка прадуктаў харчавання праз пасрэднікаў не дапускаецца.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

Ад паўсотні мільёнаў да мільярда

БЕЛАРУСЬ І ІНДЫЯ ПЛАНУЮЦЬ НАРОШЧВАЦЬ ТАВАРАЗВАРОТ

Учора Індыя адсвяткавала свой 70-ты Дзень Незалежнасці. І сёлета, дарэчы, Беларусь і Індыя адзначаюць 25-гадовы юбілей дыпламатычных адносін. Пра перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва расказаў на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі спадар Саксена Панкадж.

Ён паведаміў, што таваразварот паміж нашымі краінамі па выніках 2016 года склаў прыкладна 40 мільёнаў долараў. У той жа час яшчэ ў 2015 годзе ставілася мэта давесці адпаведны паказчык да аднаго мільярда долараў. Ці рэальная задача? На думку дыпламата, рэальная. Трэба толькі задзейнічаць усе тыя рэсурсы, якія мы маем. Буйная беларуская кампанія плануе імпартаваць з Індыі скуру для абутку. А Аршанскі льнокамбінат наладжвае кантакты з індыйскім партнёрам, які спецыялізуецца на вытворчасці тканін і адзення. На думку пасла, імпартаваных з Індыі прадуктаў магло б быць больш на беларускіх прылаўках.

Яшчэ адзін фактар, які дапаможа павялічыць двухбаковы таваразварот, — стварэнне паміж Індыяй і Еўразійскім эканамічным саюзам зоны свабоднага гандлю. Перамовы аб падпісанні адпаведнага дагавора знаходзяцца, гаворачы мовай дыпламатаў, у актыўнай фазе.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Кім Чэн Ын даў зразумець, што з ударам па Гуаме КНДР пакуль пачакае

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын, праводзячы напярэдадні агляд камандавання стратэгічных сіл Карэйскай народнай арміі, выслухаў план ваенных па нанясенні ўсёахопнага ўдару па востраве Гуам у Ціхім акіяне, які з'яўляецца часткай тэрыторыі ЗША. Пры гэтым кіраўнік КНДР даў зразумець, што ў Пхеньяне пакуль пачакаюць з запускам ракет, параіўшы Вашынгтону спыніць правакацыі. У адваротным выпадку Паўночная Карэя адкрые агонь, папярэдзіў яе лідар.

Гары Каспараў аднавіў шахматную кар'еру пасля 12-гадовага перапынку

Трынаццаты чэмпіён свету па шахматах стартаваў на буйным турніры па рапідзе і бліцы Grand Chess Tour у Сент-Луісе (ЗША). У першым туры спаборніцтваў па хуткіх шахматах Каспараў белымі фігурамі згуляў унічыю з дзеючым чэмпіёнам свету па бліцы расіянінам Сяргеем Каракіным. У другім туры ён разышоўся ўнічыю з амерыканцам Хікару Накамурам, а ў трэцім — падзяліў ачкі з кубінцам Леньерам Дамінгесам. Гары Каспараў з 1985-га па 1993 год утрымліваў званне чэмпіёна свету. Ён завяршыў кар'еру ў 2005 годзе і з тых часоў некалькі разоў прымаў удзел у таварыскіх спаборніцтвах. У пачатку ліпеня гросмайстар абвясціў аб аднаўленні кар'еры дзеля выступлення на этапе серыі Гран-тура ў Сент-Луісе, прызавы фонд якога складае 150 тысяч долараў.

Біл Гейтс зрабіў найбуйнейшае з 2000 года ахвяраванне

Заснавальнік кампаніі Microsoft і найбагацейшы бізнесмен свету Біл Гейтс, які рэгулярна ўдзельнічае ў дабрачынных акцыях, зрабіў сваё самае буйное з 2000 года ахвяраванне. Яго сума склала 4,6 млрд долараў. Па інфармацыі агенцтва, 61-гадовы амерыканскі мільярдэр ахвяраваў каля 5% акцый сваёй кампаніі яшчэ ў пачатку чэрвеня. Якая арганізацыя атрымала гэтыя грошы, невядома. Асноўныя ахвяраванні бізнесмен уносіць у свой дабрачынны фонд Bill & Melinda Gates Foundation, які ён заснаваў разам з жонкай Меліндай. Фонд займаецца праектамі ў галіне аховы здароўя і барацьбой з беднасцю. Сродкі фонду накіроўваліся на праграму па папярэджанні і лячэнні ВІЧ/СНІДу і сухотаў, на барацьбу з малярыяй, укладваліся ў праекты па імунізацыі дзяцей у Індыі і Афрыцы.

Ежа з насякомых з'явіцца ў продажы ў Швейцарыі

Другая па велічыні швейцарская сетка супермаркетаў пачне прадаваць бургеры з насякомых для спажывання людзьмі, пасля таго як мясцовыя законы па харчовай бяспецы былі перагледжаныя. Супермаркет Coop заявіў, што прадукцыя, у аснове якой — насякомыя, такая як мучныя бургеры і фрыкадэлькі з багатага пратэінамі мучнога жучка, паступіць у продаж на наступным тыдні. Як заявіў прадстаўнік швейцарскага ведамства па харчовай бяспецы, Швейцарыя — першая еўрапейская краіна, якая дазваляе продаж прадуктаў харчавання, заснаваных на насякомых, для ўжывання ў ежу людзьмі.

■ Аты-баты

На ўвесь свет гучыць... «Паланэз»

Гонар айчыннага абаронна-прамысловага комплексу — рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз» — з'яўляецца адной з найлепшых у свеце. Распрацоўка беларускіх майстроў, па меркаванні інтэрнэт-відэаканала «Арміі свету», займае трэцяе месца з дзесяці ў топе рэактыўных сістэм залпавага агню, вядомых сусветнай супольнасці на цяперашні момант.

Па тактыка-тэхнічных характарыстыках і іншых крытэрыях, па якіх рабілі высновы эксперты, «Паланэз» апярэджвае толькі тая зброя, што стаіць на ўзбраенні кітайскай арміі. Акрамя таго, у топ-10 увайшлі сістэмы залпавага агню расійскай, турэцкай, ізраільскай, амерыканскай і іншай вытворчасці.

Нагадаем, на ўзбраенне беларускага войска «Паланэз» паступіў усяго год таму, але ўжо паспеў зарэкамендаваць сябе як самая магутная зброя ў беларускай арміі, якая адпавядае найлепшым сусветным аналагам. Толькі адным залпам на адлегласці да 200 кіламетраў з высокай дакладнасцю сістэма залпавага агню адначасова трапляе ў 48 асобных цэляў.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Сямейная палітыка

КАЛІ ЗА НЯНЬКУ — ТАТА

6 з 10 мужчын падтрымліваюць ідэю «дэкрэтнага» водпуску для бацькаў

Каб вывучыць грамадскую думку наконт кароткатэрміновага водпуску для татаў, Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ў красавіку — маі гэтага года правёў сацыялагічнае апытанне. Выбарка склала 1000 рэспандэнтаў, ахоплена 78 населеных пунктаў — ад абласных гарадоў да вёсак.

На пытанне «Як вы ставіцеся да магчымасці ўвядзення бацькаўскага водпуску пры нараджэнні дзіцяці?» 66,2 працэнта адказалі, што падтрымліваюць. Сярод мужчын станоўча адказалі 61,2 працэнта, сярод жанчын — 70,3. Пры гэтым 43,9 працэнта рэспандэнтаў запэўнілі, што іх сям'я скарысталася б такім «дэкрэтным», калі б ён быў прадугледжаны заканадаўствам. Найбольшая доля станоўчых адказаў (амаль палова) прыпадае на катэгорыю асоб ва ўзросце ад 30 да 44 гадоў.

Якім будзе бацькаўскі водпуск? Плануецца, што яго будуць даваць на тэрмін да 14 дзён. Узяць яго можна аднаразова, у першыя паўгода пасля нараджэння дзіцяці — у той жа час, калі маці знаходзіцца ў сацыяльным водпуску.

— Мы ведаем, што гэта найбольш складаны перыяд, калі жанчына мае патрэбу ў старонняй дапамозе. Не заўсёды дапамога ёсць з боку бабуль ці іншых сваякоў. І самы блізкі чалавек — тата — павінен мець магчымасць правесці гэты час з сям'ёй, — тлумачыць **намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.**

Абавязковы бацькаўскі водпуск заканадаўча замацаваны ў 25 краінах. Абавязковы ён перш за ўсё для наймальнікаў: гэта імператыўнае права работніка скарыстацца дадзенай гарантыяй, і работадаўца мусіць яе забяспечыць. Але 14-дзённы «дэкрэт» для беларускіх татаў не будзе аплачвацца (па аналогіі з водпускамі па сямейных абставінах, на перыяд вучобы).

Трэба сказаць, што сем'ям з дзецьмі ўдзяляецца асаблівая ўвага. Больш за 553 тысячы малых ахоплены сістэмай дзяржаўных дапамог — гэта амаль кожнае трэцяе дзіця. Дзяцей ранняга ўзросту забяспечваюць бясплатнымі прадуктамі харчавання. У першым паўгоддзі такую падтрымку мелі восем працэнтаў малых да двух гадоў. Сярэдні кошт месячнага набору прадуктаў харчавання склаў каля 85 рублёў.

Вельмі запатрабаваная паслуга сацыяльнай няньки. За студзень — чэрвень ёй скарысталася 1881 сям'я (з іх 152 — з дзецьмі-інвалідамі). Гэта амаль столькі ж, колькі за ўвесь мінулы год (у 2016-м няньки прыходзілі ў 1985 сем'яў).

Працягваецца праграма сямейнага капіталу. На 1 жніўня ў Беларусбанку было адкрыта 40,3 тысячы дэпазітных рахункаў на агульную суму больш за 403 мільёны долараў. Марына Арцёменка адзначае, што ўсе гэтыя меры дазволілі павысіць колькасць трэціх і наступных дзяцей у сем'ях. Так, калі ў 2014-м такіх дзяцей нарадзілася 17,3 тысячы, то летась — 22 тысячы. А колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася да 91,6 тысячы.

Грашовыя выплаты прадугледжаны таксама для сем'яў, што ўсынавілі малых. **Маргарыта МАЦВЕЕНКА, начальнік аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Міністэрства адукацыі**, заўважае, што гэта дазваляе і падтрымаць сям'ю матэрыяльна, і адзначыць тую высакародную справу, якую яна зрабіла. Выплаты на ўтрыманне сёння забяспечаны больш як шасці тысячам непаўналетніх — каля 90 працэнтаў ад усіх усыноўленых хлопчыкаў і дзяўчатак.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ У пачатку было слова

Не толькі карціны, але і старадрукі

Нацыянальны мастацкі музей рыхтуе адмысловую выстаўку, прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Тут будуць прадстаўленыя самыя рэдкія выданні з кніжнага збору музея, які налічвае каля дзвюх соцень адзінак. Некаторыя прадметы датуюцца пачаткам XVIII стагоддзя, а самая старая з беларускіх кніг калекцыі — Евангелле з сігнатурамі 1600 года, надрукаваная ў Вільні ў друкарні братоў Мамонічаў, — будзе ўпершыню прадстаўленая публіцы пасля рэстаўрацыі. Над аднаўленнем гэтага выдання зараз працуе вядомы рэстаўратар Андрэй Крапіўка.

Выстаўка рарытэтаў кніжнай калекцыі музея стане даступнай для наведвальнікаў 20 верасня.

— Наш кніжны збор пачаў фарміравацца ў 1954 годзе, калі ў фонды паступіла рукапіснае Евангелле XVI стагоддзя, — расказаў **генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ**. — Калекцыю паступова склалі рукапісныя кнігі, выданні, надрукаваныя лацінскім шрыфтам і кірыліцай у XVI — пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі, Украіны, у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Фарміраванне і папаўненне калекцыі было ў многім звязана з экспедыцыйнай дзейнасцю супрацоўнікаў музея пасля вайны. У закрытых касцёлах, цэрквах разам з каштоўнымі творамі мастацтва знаходзілі не менш каштоўныя кнігі, некаторыя выданні мы атрымалі ў падарунак, а некаторыя набылі.

Мастацкі музей сёння можна назваць адной з самых яркіх пляцовак, дзе адбываюцца прэзентацыі кніг, тут таксама працуюць над падрыхтоўкай адмысловай серыі «Славутыя мастакі з Беларусі», у межах якой ужо пабачыла свет больш як 20 выданняў. Кнігамі музей праз два гады адзначыць і сваё 80-годдзе: распрацоўваецца канцэпцыя каля дзясятка грунтоўных фаліянтаў, што распавядуць пра зборы гэтай багатай на каштоўнасці ўстановы.

Неварта забывацца і на мастацкую скарыніяну. Так, як заўважыў Уладзімір Пракапцоў, у фондах Нацыянальнага мастацкага музея захоўваецца, а ў яго асноўнай экспазіцыі прадстаўляецца нямала твораў-прысвячэнняў першадрукару. Гэта, у прыватнасці, работы Арлена Кашкурэвіча, Міхаіла Савіцкага, Анатоля Тычыны, Гаўрылы Вашчанкі, Уладзіміра Крукоўскага, Васіля Шаранговіча і многіх іншых творцаў, якія натхняліся вобразам Францыска Скарыны і паслядоўнікаў.

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

Дзеці ў цэнтры ўвагі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама ў гандлёвых цэнтрах высадзіцца дэсант актывістаў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных. Яны будуць раздаваць пакупнікам брашуры «Што рабіць, калі...», дзе апісаны алгарытм дзеянняў пры разнастайных надзвычайных сітуацыях, буклеты, памяткі для бацькоў, каляндарыкі.

Вучэбная эвакуацыя

«Першы званок» у школах сёлета прагучыць 1 верасня. Гэтая дата і стане пачаткам другога этапу акцыі.

— Прычым ужо ў гэты дзень на школьных лінейках і класных гадзінах супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Таварыства ратавання на водах правядуць з вучнямі прафілактычныя гутаркі, — працягвае Вольга Мельчанка. — Яны раскажуць пра асноўныя прычыны пажараў, падкажуць, як папярэдзіць бяду і як дзейнічаць пры абстаноўцы, якая пагражае жыццю і здароўю. Вучням пакажуць тэматычныя стужкі, знятыя паводле рэальных фактаў. А для тых, хто пакуль што спасцігае навуку ў пачатковай школе, падрыхтаваны спецыяльныя мультфільмы. Ім жа раздадуць шмат наглядных прадукцыі.

Акрамя таго, з 1 па 16 верасня ва ўсіх школах Беларусі ратавальнікі дадуць тэматычныя «Урокі бяспекі». Завітаюць яны і на бацькоўскія сходы.

Але на адной тэорыі навучанне не спыніцца. У кожнай школе абавязкова будзе арганізавана вучэбная эвакуацыя.

Пра бяспеку — праз інтэрактыўнасць

А 18 верасня ратавальнікі завітаюць у дзіцячыя садкі.

— Для нас гэтая катэгорыя дзяцей — бадай што самая спецыфічная, — разважае Вольга Мельчанка. — Кнігі і буклеты, якія можна падарыць першакласнікам, дашкалятам, якія не ўмеюць чытаць, дапамогуць мала. І таму застаецца толькі гуляць на блізкіх асацыяцыях, каб малыя вучыліся бачыць сувязь паміж нейкім дзеяннем і яго вынікам. Тут мы выкарыстоўваем тэатралізаваныя пастаноўкі і інтэрактыўныя гульні. Самае галоўнае для нас — навучыць выхаванцаў садкоў, як трэба сябе паводзіць у надзвычайнай сітуацыі і як клікаць на дапамогу. Не забудземся і пра бацькоў: з імі пагутараць ратавальнікі і правядуць навучальныя інструктажы, а таксама пакажуць тэматычныя відэастужкі.

Дарэчы, па стане на 15 жніўня ў Беларусі адбыліся 3264 пажары, на якіх загінулі 263 чалавекі. Сярод іх — чацвёра дзяцей.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

ТЫМ ЧАСАМ

На пачатку тыдня ў інтэрнэт трапілі шакуючыя здымкі. На знешнім баку парэнчаў балкона сталічнага гмаха павіс хлопец. Яго ў гэты час фатаграфаваў іншы падлетак. А пад навяспечаным «руферам» было 26 паверхаў бездані.

— Пакуль не высветлены асобы гэтых двух непаўналетніх, — кажа **афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ**. — Я гутарыў з відавочцамі, але ў міліцыю яны вырашылі не звяртацца. Яны мяркуюць, што гэта хтосьці з мясцовых жыхароў, і таму хочуць самі паразмаўляць з іх бацькамі.

Менавіта апошнія і павінны кантраляваць паводзіны сваіх дзяцей. Бо акрамя іх, гэта не зробіць ніхто. Тым больш, што і іх могуць прыцягнуць да адказнасці за неналежнае выхаванне. А самі падлеткі рызыкуюць трапіць на ўлік у камісію па справах непаўналетніх.

■ За падзеяй

КВЕТКІ ДЛЯ НАРОДНАГА ПАЭТА

Дзеячы культуры ўшанавалі памяць Якуба Коласа

Ужо па традыцыі ў дзень памяці паэта, каля яго магілы на Ваенных могілках сталіцы з кветкамі ў руках сабраліся пісьменнікі, мастакі, навукоўцы, журналісты, бібліятэкары. Арганізатарамі памінальнага мітынгу сталі супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Прыйсці на магілу да народнага беларускага пісьменніка і паэта, як да блізкага чалавека, у гадавіну з дня яго смерці (Якуба Коласа не стала 13 жніўня 1956 года), успомніць нябожчыка як творцу і як чалавека... З прамовамі выступілі **дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ**, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, літаратары Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Уладзімір Мазго, скульптар Іван Міско. Дарэчы, апошні падчас свайго кароткага выступлення выказаў прапанову надаць сталічнаму парку імя Горкага імя Якуба Коласа. Менавіта на гэтым месцы да Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся дом паэта.

— Якуб Колас заўсёды азіраўся на пройдзены шлях, і яму здавалася, што ён мог зрабіць значна больш, — зазначыла **дырэктар літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ.** — Але мы ўпэўненыя, што Колас паспеў выканаць надзвычай карысную працу і шмат пакінуў нам, нашчадкам. Мы ж павінны захоўваць яго ідэі і жыць у адпаведнасці з запаветамі, што ён пакінуў на старонках сваіх твораў.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

■ На слыху

Беларусы пацярпелі ў ДТЗ у Калужскай вобласці

У дарожна-транспартным здарэнні, якое адбылося ў Калужскай вобласці, загінуў адзін грамадзянін Беларусі, дзевяць нашых суайчыннікаў былі шпіталізаваны.

Консульская служба пасольства Беларусі ў Расіі са спасылкай на інфармацыю ДІБДР паведаміла, што на 138-ым кіламетры Калужскай шашы аўтадарогі Масква—Малаяраславец—Рослаўль адбылося ДТЗ з удзелам двух транспартных сродкаў, якія маюць беларускую рэгістрацыю. Усе пацярпелыя беларусы шпіталізаваны ў Малаяраславецкую цэнтральную раённую бальніцу і Калужскую абласную бальніцу. Адзін з іх знаходзіцца ў рэанімацыі ў цяжкім стане. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, усе пацярпелыя пражываюць у Гомельскай вобласці, за выключэннем аднаго жыхара Гродзенскай вобласці. Загінулы з'яўляўся жыхаром Калінкавічаў. Ідзе ўдакладненне звестак па астатніх пасажырах (у транспартных сродках знаходзілася 37 грамадзян Беларусі), інфармацыя накіроўваецца ў абласныя УУС для інфармавання сваякоў. Консульская служба пасольства знаходзіцца ў пастаянным кантакце з медыцынскімі ўстановамі, УУС і ДІБДР рэгіёна. Паводле папярэдняй інфармацыі, кіроўца аўтамабіля «Фольксваген Мультывэн» выехаў на паласу сустрэчнага руху, затым у кювет, што пацягнула датычнае сутыкненне аўтамабіля «Мерседэс-Бенц» (Тонар) з аўтобусам «Неаплан».

Чарговае здарэнне з гадзюкай

У Рагачоўскім раёне гадзюка ўкусіла сямігадовую дзяўчынку.

Гэта ўжо трэці выпадак за тыдзень, калі людзі сустракаюцца з гэтай змяёй у населеных пунктах, і другі — калі церпяць ад іх (у мінулым нумары мы пісалі пра ўкус 10-гадовага хлопчыка ў сталіцы).

Інцыдэнт адбыўся за некалькі кіламетраў ад Рагачова ў дачным каапаратыве. Вядома, што дзяўчынка прыехала пагасціць да бабулі. Адразу пасля таго, што здарылася, пацярпелая была шпіталізавана ў рэанімацыйнае аддзяленне Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы. Для далейшага лячэння дзяўчынку перавелі ў Гомельскую абласную клінічную бальніцу, дзе яна знаходзіцца дагэтуль. Стан пацыенткі стабільны, сярэдняй ступені цяжкасці.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ПЕРАВАГІ АЙЧЫННАЙ СЕЛЕКЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навукова-практычны цэнтр НАН па земляробстве ажыццяўляе селекцыйны працэс па 42 сельскагаспадарчых культурах. «Гэта практычна ўсе збожжавыя, азімыя, крупяныя. Таксама вядзецца селекцыйны працэс па 19 відах шматгадовых бабовых і злакавых траў. Акрамя таго, 75 нашых сартоў уключаны ў рэестр іншых краін», — паведаміў вучоны.

Спецыялісты актыўна працуюць над тым, каб знізіць імпарт бялковых напаўняльнікаў, на якія штогод выдаткоўваецца каля 300 млн долараў. З гэтай мэтай створаныя новыя сарты раслін. Вядзецца селекцыя лубіну, гароху.

З уводам у Беларусі ў эксплуатацыю двух кукурузакалібровачных заводаў у значнай ступені ўдалося вырашыць пытанне па набыцці насення кукурузы. «Калі яшчэ 15 гадоў таму лічылася, што кукуруза — культура паўднёвых рэгіёнаў, то сёння ў брэсцкім філіяле Інстытута раслінаводства створана ўжо 10 гібрыдаў кукурузы беларускай вытворчасці, якія на 50% замяняюць імпарт. Там жа створаны сарты і сланечніка, і многія іншыя культуры», — расказаў Эрома Урбан.

На селекцыі справа з раслінамі не спыняецца. Па словах вучонага, у Інстытуце глебазнаўства і аграхіміі распрацаваны комплекс угнаенняў пад пэўныя віды культур з рознічаным наборам макра- і мікраэлементаў. «Такі комплекс сёння ёсць пад цукровыя буракі, лён. Акрамя таго, Інстытут аховы раслін ужо паспеў распрацаваць больш за тры дзясят-

кі тэхналогій для абароны ад шкоднікаў і хвароб. Яны забяспечваюць захаванасць ураджаю ад 10—20% і вышэй», — дадаў эксперт.

— Кожны год сельгасвытворцы краіны на пестыцыды выдаткоўваюць каля 200 млн долараў, — праінфармаваў Дзмітрый Лужынскі. «Ступень іх таксічнасці розная. Ці можа айчынная сельская гаспадарка абысціся без хімічных сродкаў аховы? У выпадку адмовы ад «хімічнай тэрапіі» вынікі для сельскай прамысловасці па зборы ўраджаю змяншаюцца ў 3—4 разы. Прычым, калі ўжываць пестыцыды, выконваючы норму, то яны будуць раскладацца і слядоў ад іх не застанецца. У нашай краіне ідзе жорсткі кантроль па ўжыванні пестыцыдаў і іх дазіраванні, каб усё было бяспечна», — запэўніў вучоны.

Цікава, што, па інфармацыі гідраметэаслужбы, 40% ВУП краіны напрамую залежыць ад надвор'я і асноўную частку метэазалежнага прадукту складае сельская гаспадарка. Па словах навукоўцаў, залежнасць раслінаводства ад надвор'я застаецца татальнай. Дзмітрый Лужынскі адзначыў, што пакуль работай «цэха пад адкрытым небам» навукоўцы ўсіх краін свету кіраваць не навучыліся, нягледзячы на ўсе свае генетычныя распрацоўкі. «Рэгуляваць клімат чалавек можа толькі ў цяпліцах. Але павысіць устойлівасць сартоў да маразоў, напрыклад, магчыма. Мы павысілі ўстойлівасць рапсу да маразоў. Гэтыя сарты сёння вытрымліваюць 14 градусаў ніжэй за нуль. Раней магчыма было толькі мінус восем», — расказаў спецыяліст.

МЕХАНІЗАЦЫЯ «РУЛІЦЬ»

Факт — ніякая сучасная краіна не зможа атрымліваць добрыя ўраджаі без належнай механізацыі. Напрыклад, калі камбайн у сезон уборкі прастаіць толькі адзін дзень — краіна можа страціць да 150 тон збожжа. Над машынамі, таксама як і над сартамі, трэба працаваць увесь час. **Намеснік генеральнага дырэктара па ўкараненні і выпрабаваннях НПЦ НАН па механізацыі сельскай гаспадаркі Дзмітрый КОМЛАЧ** адзначае, што за апошнія 5 гадоў распрацавана больш за 100 найменняў машын і абсталявання для сельскай гаспадаркі. «Адзін з яркіх прыкладаў — Інстытут распрацаваў сеялку прамой сяўбы, якая дазваляе ў працэсе ўносіць мінеральныя ўгнаенні. Таксама мы распрацавалі глебаапрацоўчы агрэгат, у якім хуткая змена модуляў дазваляе рабіць апрацоўку глебы па ўсіх існуючых тэхналогіях», — расказаў навуковец.

Спецыялісты Навукова-практычнага цэнтра па механізацыі сёння таксама працуюць над тым, каб зменшыць страты арганічных угнаенняў, бо кошт іх вельмі высокі. Для гэтага распрацавана вялікая колькасць машын. Апошняя распрацоўка — машына для высокадакладнага ўнясення цвёрдых мінеральных угнаенняў.

«Цяпер мы займаемся тым, каб сёлета прайшлі дзяржаўныя выпрабаванні ягадаўборачнага камбайна. Плануецца, што да наступнага сезона ён з'явіцца на серыйнай вытворчасці. Варта таксама адзначыць, што ў рамках праграмы Саюзнай Дзяржавы скончылася распрацоўка і ажыццяўляецца пастаноўка на серыйную вытворчасць каля 10 машын, якія дазваляюць па градавай тэхналогіі атрымліваць высокія ўраджаі насеннай бульбы. У цэлым за апошні год мы паставілі 15 новых машын і абсталявання на серыйную вытворчасць», — рэзюмаваў Дзмітрый Комлач.

Дарэчы, тэрмін укаранення новых распрацовак у эксплуатацыю складае каля 3 гадоў. Сёлета ўжо працуе новая распрацоўка НПЦ НАН па механізацыі — тэхналагічная лінія па падрыхтоўцы насення збожжавых культур.

ТЭМА КАРМОЎ УСЁ ЯШЧЭ НЕ РАСКРЫТАЯ

Каб зразумець важнасць жывёлагадоўлі ў сельскай гаспадарцы краіны трэба памятаць адну лічбу — 65. Менавіта столькі працэнтаў валавога даходу ад аграрнага сектара эканоміка атрымлівае праз жывёлагадоўлю. Сёння ў Беларусі аграрыі карыстаюцца самымі перадавымі біятэхналогіямі на постсавецкай прасторы. Але стан спраў Беларусі ў жывёлагадоўлі навукоўцаў не задавальняе. «Мы ўжо на працягу 10 гадоў не можам перайсці мяжу ўдояў у 5 тысяч кілаграм малака на карову ў год», — прыводзіць сярэднія лічбы па краіне **першы намеснік генеральнага дырэктара НПЦ НАН па жывёлагадоўлі Іван ШАЙКО**.

Паводле яго слоў, навукоўцы распрацавалі тэхналогіі ў селекцыі, прапісалі і рэкамендацыі па нарыхтоўцы кармоў. Але кармленне ў многіх гаспадарках усё яшчэ ажыццяўляецца неэфектыўна. «Мы павінны змяніць падыходы, каб вытрымаць тэхналагічныя параметры травяных кармоў. Генатыпы нашых кароў ужо цяпер здольныя падняць узровень удояў да 7,5 тысячы кілаграм у год. Галоўнае — карміць правільна», — выказаў сваё меркаванне вучоны. На яго думку, праблему вырашыць паляпшэнне якасці травяных кармоў з дадаваннем да 30% бялковай часткі.

Навуковец таксама адзначыў, што ў 2017—2018 гадах плануецца стварыць сумесныя селекцыйна-генетычныя цэнтры ў Беларусі і Расіі. Гэтае пытанне абмяркоўвалася 30 чэрвеня на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Такія цэнтры будуць створаны па малочнай жывёлагадоўлі, насенняводстве, птушкагадоўлі з выкарыстаннем найноўшых біятэхналагічных прыёмаў і метадаў. На працягу наступных пяці гадоў спецыялісты плануюць ужо атрымаць вынік.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

■ Вясёлае лета

На ваду спусцілі... МАЗ. А за ім — святочны торт

Унікальны для Беларусі заплыў «на чым папала» прайшоў на Аўгустоўскім канале

Гэта відовішча ўжо трэці год запар здзіўляе сваім нестандартным падыходам. Удзельнікі, а іх набіраецца каля 20, плывуць хто на чым здатны — і на будаўнічай пляцоўцы, і на Эйфелевай вежы, і ў кампаніі са знакамітым Сальвадорам Далі. Сёлета аварыйныя службы яшчэ раз звярнулі ўвагу на меры бяспекі, а камунальнікі прызвалі да збору другаснай сыравіны. Усе ўдзельнікі шчаслива дабраліся да фінішу.

Гэта адно з тых мерапрыемстваў, якое хочацца ўбачыць дзеля ўласных эмоцый. І такіх аматараў на канале сабралася некалькі тысяч, як вызначылі арганізатары. Вядома, значную частку склалі самі ўдзельнікі незвычайнага заплыву. Напрыклад, з Ваўкавыска прыехала цэлая каманда моцных мужчын, каб выгрузіць вялікі МАЗ, хоць ён і быў зроблены з лёгкага пластыку і пенапласту. Здавалася, што смеццявоз ідзе сваім ходам па вадзе. Камунальнікі такім чынам яшчэ раз звярнулі ўвагу на раздзельны збор смецця. Напрыклад, летась яны плылі на пэт-бутэльках.

Металічныя бочкі, шыны, балоны — усё ішло ў ход, каб надаць пляцоўкам устойлівасць. Праўда, на гэты падводны «фундамент» мала хто звяртаў увагу. Куды цікавей было назіраць за тым, што плыло наверсе. А тут узвышалася Эйфелева вежа (Смаргонскі раён), плыў «Хутарок у Зосі» (Слонімскі раён), з гастрольным турам прыбыла Верка Сярдзючка (прадпрымальнік Тамара Казлоўская).

Весела плыла вялікая будаўнічая пляцоўка з дымам, веласіпедная паркоўка, на якой размясцілася цэлая група спарстменаў-аматараў, вядома ж, пірацкія караблі і нават акула Маша. У гонар 15-годдзя БРСМ члены гродзенскай арганізацыі пусцілі па вадзе вялікі святочны торт. На вёслы селі прадстаўнікі студэнцкіх атрадаў, валанцёры. Работнікі газавай службы прыплылі на сваім «фірмавым» аўтамабілі, і не проста так, а з феерверкам. Прадстаўнікі хімічнай галіны перасцяраглі ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Свае плывучыя сродкі прадставіў кожны раён вобласці і горад Гродна. На канал прыплыў нават сам Сальвадор Далі ў чорным фраку і цыліндры. Плот Гродзенскага раёна пад назвай «Гала» з вялікім белым яйкам пасярэдзіне адразу прыцягнуў увагу. Тут знаходзілася многа невядомых істот, наперадзе былі ўсталяваны вялікія чырвоныя вусны. Ідэю ажыццявілі ў СПК «Прагрэс-Верцялішкі», прадстаўнікі якога пабывалі ў Іспаніі і вельмі былі ўражаны творчасцю знакамітага мастака. Плывучы сюррэалізм не пакінуў абыякавымі і членаў журы, яны прысудзілі яму Гран-пры. Дарэчы, намінацый было нямала: і самы непатапляльны, і самы арыгінальны, і самы музыкальны...

Трэба сказаць, што ідэя такіх заплываў «на чым папала» перанята ад польскіх суседзяў. На тым баку Аўгустоўскага канала яны праводзяцца ўжо больш за 20 гадоў. У гродзенцаў заплыў стаў кульмінацыяй «Свята мора», новага мерапрыемства, якое будзе традыцыйна праходзіць на канале ў жніўні. Зараз у яго арганізацыі прынялі ўдзел упраўленне спорту і турызму аблвыканкама, Гродзенскі райвыканкам, БРСМ.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

Наталля РАМАНОВІЧ, начальнік аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Гродзенскага райвыканкама:

— Праграма свята атрымалася насычанай. Папулярным становіцца «балотны» футбол. Гэтым разам у спаборніцтве прынялі ўдзел каля 30 камандаў, з іх 8 — жаночых. Многія маглі паспаборнічаць у кіданні рыбацкага бота і выратавальнага круга. Для рыбакоў таксама быў арганізаваны свой конкурс. Дзяцей забаўлялі Нептун і Залатая Рыбка. Нашы традыцыйныя падворкі былі абсталяваны на марскую тэму. На другі год плануем пусціць дадаткова транспарт з Гродна, можна дабавіць яшчэ гандлёвых пунктаў, асабліва з ахаладжальнымі напоямі, каб забяспечыць больш камфортны адпачынак, без доўгіх чэргаў.

Мясцовае самакіраванне
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
16 жніўня 2017 г. №30 (414)

СТРАТЭГІЯ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ

Чакаем эфекту

Бізнес і дзяржаўныя чыноўнікі ўжо шмат гадоў дыскутуюць на тэму, як трэба правільна працаваць. Бізнесмены, можа, і ведаюць, чаго яны хочуць, але адзінага меркавання ў іх усё ж няма. Дзяржава, у сваю чаргу, хоча кантраляваць законнасць праявы дзелавой ініцыятывы, рабіць яе празрыстай, простай і атрымліваць пры гэтым ад прадпрымальнікаў падаткі.

Шэраг дакументаў, якія павінны спрасціць працу дзелавога асяроддзя ў краіне, распрацоўваюцца і кантралююцца на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. На Нацыянальным прававым партале ўжо некалькі месяцаў для грамадскага абмеркавання апублікаваны пакет дакументаў аб спрашчэнні ўмоў вядзення бізнесу: Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб развіцці прадпрымальніцтва і выключэнні залішніх патрабаванняў, што прад'яўляюцца да бізнесу»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці»; Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых мерах па стварэнні ўмоў для развіцця гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва» і іншыя.

Дзякуючы гэтым дакументам мяркуецца спрашчэнне працэдуры адкрыцця бізнесу і вядзення сваёй справы, істотнае змяншэнне колькасці праверак. Будзе павялічана колькасць відаў дзейнасці, якімі можна займацца без рэгістрацыі ІП пры ўмове выплаты адзінага падатку. Таксама павінен з'явіцца інстытут падатковых кансультантаў — пасярэднікаў паміж бізнесам і падатковымі органамі. У сферы грамадскага харчавання знікне рэгуляванне асартыменту ўласнай прадукцыі грамадскага харчавання. Таксама ўстановы грамадскага харчавання будуць надзелены правам вырашаць, ці можна чалавеку прыносіць ва ўстанову свае спіртныя напоі.

Разняволенне бізнесу запланавана сёлета на першага кастрычніка.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviada.by*

ТЭМА ТЫДНЯ

МАЛЕНЬКАМУ КАРАБЛЮ — ВЯЛІКАЕ ПЛАВАННЕ?

Як развіваецца сфера малога бізнесу ў нашай краіне

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

УСЁ тое, што выпускаюць суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, складала ў апошнія гады ад 19 да 26% — пятую частку ці нават чвэрць — ад валавога ўнутранага прадукту краіны. І няхай гэты паказчык у мінулым годзе ў параўнанні з 2015-м нават павялічыўся, але колькасць такіх прадпрыемстваў у апошнія гады змяншаецца. Чаму так адбываецца? Што перашкаджае развівацца суб'ектам малога прадпрымальніцтва? З якімі праблемамі даводзіцца сустракацца тым, хто ўсё ж такі вырашыў займацца ўласнай справай? Адказы на гэтыя пытанні мы шукалі разам з экспертамі.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Надзея СМАЛЯКОВА і Аляксандр ПІКУЛЯ.

ВЫХАВАННЕ ПРЫГАЖОСЦЮ

Жыхары мікразоны Падгорнай у Магілёве даўно чакаюць, калі ў іх правядуць конкурс на самае лепшае падвор'е

— Апошні раз адміністрацыя Ленінскага райвыканкама вызначала найлепшых тры гады таму, а потым пра нас наогул забыліся, — абураўся, завітаўшы ў карпункт «Звязды», староста аб'яднанай мікразоны Падгорная і Падміколле Аляксандр ПІКУЛЯ. — Хоць я шмат разоў нагадваў пра гэта. Жыхары хвалююцца, чакаюць, каб іх ацанілі. Бачылі б вы, якую прыгажосць яны зрабілі на сваіх участках!

Сажалка з чырвонымі рыбкамі

Аляксандр Пікуля растлумачыў свой зварот проста: «Накіпела». Маўляў, рукі апускаюцца нешта рабіць, калі нікому да гэтага няма справы. І газета не стала адкладаць такі вельмі патрэбны рэпартаж на потым. Наведаць усіх дастойных не атрымалася, але тое, што ўбачылі, і сапраўды ўразіла.

Надзея Аляксандраўна СМАЛЯКОВА з задавальненнем паказвае нам сваю прыгажосць, якую, па яе словах, зрабіў сын, дэманструе сапраўдны райскі куточак з арэлямі, сажалкай і нават невялічкім фантанам.

стар. 8

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

ТУРЭЦКІ ВІЗІТ

У членаў беларускага парламента адбылася рабочая паездка

На мінулым тыдні парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам знаходзілася з візітам у Турэцкай Рэспубліцы. Візіт парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Турцыю паспрыяў далейшай актывізацыі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, абмеркаванню перспектыўных напрамкаў супрацоўніцтва, а таксама іншых пытанняў, якія маюць узаемную цікавасць.

7 жніўня ў Анкары ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча са Старшынёй Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі Ісмаілам Кахраманам. Бакі абмеркавалі перспектывы актывізацыі міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў важнасць пашырэння кантактаў паміж групамі дружбы, якія дзейнічаюць у парламентах дзвюх краін, а таксама пацвердзіў гатоўнасць прыняць у Беларусі дэлегацыю групы дружбы Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі. Кіраўнік беларускай дэлегацыі адзначыў, што ў Беларусі станоўча ацэньваюць дружалюбныя крокі з боку Турцыі ў рамках узаемадзеяння на розных міжнародных пляцоўках.

ІРАН ГАТОВЫ ДА СУМЕСНАЙ ПРАЦЫ

Прэзідэнт гэтай краіны адзначыў высокую ролю Беларусі ў наладжванні адносін з ЕАЭС

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч правёў сустрэчу з нававыбраным Прэзідэнтам Ірана Хасанам Раўхані і ад імя кіраўніка беларускай дзяржавы павіншаваў яго з афіцыйным уступленнем на пасаду. У ходзе сустрэчы бакі абмеркавалі пытанні развіцця двухбаковых адносін, гандлёва-эканамічнага, гуманітарнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

Адной з тэм абмеркавання сталі перспектыўныя сумесныя праекты ў машынабудаўнічай галіне. Хасан Раўхані, паказаўшы на важнасць прамысловай кааперацыі дзвюх краін, асабліва адзначыў высокі ўзровень якасці беларускай прадукцыі. Бакамі падкрэслена важнасць супрацоўніцтва ў рамках міжнароднага транспартнага калідора «Поўнач — Поўдзень», здольнага пашырыць гарызонты двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін і забяспечыць рост узаемнага тавараабароту.

Прэзідэнт Ірана падзякаваў Рэспубліцы Беларусь за канструктыўную ролю, якую яна адыгрывае ў працэсе заключэння пагаднення паміж ЕАЭС і Іранам, адзначыўшы, што гэта аб'яднанне фарміруе «новую якасць» эканамічных сувязяў у рэгіёне. Прэзідэнт Ірана пацвердзіў запрашэнне ў адрас Аляксандра Лукашэнкі наведаць Ісламскую Рэспубліку Іран з афіцыйным візітам.

ТРЭБА ПАВЫШАЦЬ НАРАДЖАЛЬНАСЦЬ

Ці магчымая даплата жанчынам падчас дэкрэта?

Каб быць эфектыўным, Кодэкс аб здароўі павінен мець пад сабой падрыхтаваную глебу. Такую думку аб новым для краіны дакументе выказаў член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці і начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый Дзяркач.

«Каб быць эфектыўным, новы дакумент аб здароўі павінен мець пад сабой падрыхтаваную глебу. У адваротным выпадку, нават пры наяўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы, высокім узроўні медыцыны і іншых службаў, але пры адсутнасці свядомасці людзей, мы нічога зрабіць не зможам», — лічыць сенатар.

Таксама Юрый Дзяркач у інтэрв'ю газеце «Витебские вести» расказаў пра разгледжаныя камісіяй законапраекты. «Адна з самых важных, на мой погляд, тэм датычыцца матывацыі да нараджэння дзяцей і стварэння дадатковых умоў для маладой сям'і. Цяпер разглядаецца законапраект аб тым, каб жанчыны, якія маюць больш за адно дзіця і знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску, атрымлівалі даплаты і на іншых непаўналетніх дзяцей. Паступова дзяржпадтрымка сем'яў з дзецьмі павялічваецца. І гэта як ніколі дарэчы. У Беларусі назіраецца зніжэнне колькасці жанчын актыўнага дзетароднага ўзросту, паколькі ў яго пачало ўступаць малаколькаснае пакаленне 1990-х гг. Паступовае зніжэнне ўзроўню нараджальнасці рэгіструецца ва ўсіх рэгіёнах. У нас такую негатыўную тэндэнцыю ўдалося кампенсаваць за кошт павелічэння колькасці нараджэння другога, трэцяга і наступнага дзяцей, у чым не апошнюю ролю адыгрываюць прэферэнцыі для шматдзетных сем'яў», — паведаміў член Савета Рэспублікі.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

НЕБЯСПЕКА НА КАНТРОЛІ

НЕМАЛЕНЬКАЯ ПРАБЛЕМА

На Віцебшчыне штогод ад знешніх прычын гіне, вобразна кажучы, цэлы клас. І, каб да мінімуму звесці магчымасць гібелі дзятвы і падлеткаў ад так званых знешніх прычын, распрацаваны прафілактычныя мерапрыемствы. У прыватнасці, яны датычацца кар'ераў, штучных вадаёмаў. Аказваецца, заканадаўствам не рэгулююцца нюансы здабычы пяску. У выніку амаль штогод там гінуць дзеці — з-за высокай імавернасці абвалаў. Вопыт па каардынацыі розных ведамстваў па папярэджванні здарэнняў цікавы для пераймання.

Чый кар'ер?

У Віцебскай вобласці налічваецца каля 210 тысяч дзяцей, у тым ліку больш за 44 тысячы падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Для параўнання, колькасць насельніцтва перавышае 1,2 мільёна. На жаль, кожны год гінуць ад 20 да 30 дзяцей.

Як паведаміў **старшы памочнік пракурора вобласці па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Антон ВОЛКАЎ**, тры гады таму ў Глыбоцкім раёне двух хлопчыкаў засыпала пяском. Ім было ўсяго 9 і 11 гадоў. Дзяўчынцы, якая там таксама гуляла, пашанцавала больш — цудам выкараскалася. Калі пачалі разбірацца ў прычынах трагедыі, зацікавіліся: а што было зроблена для таго, каб бяды не здарылася? Згодна з заканадаўствам эксплуатацыя кар'ераў рэгулюецца толькі зямельным кодэксам. А як здабываць пясок, як зрабіць, каб грунт быў больш-менш бяспечным і не абвальваўся? Гэта нідзе прапісана не было... А ў кожным раёне такіх кар'ераў ад 10 да 30!

Нямала сумных прыкладаў і таго, як дзеці тонуць у сажалках. Пасля чарговай трагедыі прадстаўнікі пракуратуры спрабавалі высветліць, на чыім жа яна балансе. Ніякіх дакументаў не існавала. Выпадкова нехта падказаў, што ў свой час яна была зроблена для эксплуатацыі ў тэхнічных мэтах. Але ніхто не клапаціўся, каб зрабіць бяспечныя падыходы да вады.

Пракуратура Віцебскай вобласці выйшла з прапановамі да кіраўніцтва аблвыканкама, каб папярэдзіць гібель у кар'ерах і сажалках, закінутых будынках, на безгаспадарных аб'ектах будаўніцтва, звалках, іншых небяспечных для дзяцей месцах. Каб органы мясцовай улады стварылі, нарэшце, пашпарты патэнцыйна небяспечных аб'ектаў для дзяцей. Цяпер яны ствараюцца — пры актыўным удзеле сельвыканкамаў. Прычым ствараюцца не для справаздачы, а ў якасці сур'ёзнай прафілактычнай меры.

Да таго ж за кожным пракурорам замацаваны вучэбныя ўстановы ў рэгіёнах, дзе яны праводзяць абавязковыя гутаркі. Выступаюць на бацькоўскіх сходах, дэманструюць прафілактычныя фота і відэазапісы. Ёсць адзіны дзень інфармавання ў школах, ліцэях, каледжах. Таксама праводзяцца прафілактычныя гутаркі па месцы работы бацькоў.

Эфект дэкрэта

У камісіі па справах непаўналетніх аблвыканкама не раз агучвалі захады, што робяцца ў рамках выканання Дэкрэта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях».

Праваахоўныя органы канстатуюць, што ў ліку іншага дзякуючы дэкрэту ў разы знізілася злачыннасць сярод непаўналетніх. У прыватнасці, на Віцебшчыне ўдзельная вага яе сярод усіх злачынстваў складае 2,3%. У краіне ў сярэднім каля 3%. А да прыняцця дэкрэта (у канцы 2006 года) гэты паказчык быў на ўзроўні 7,4%. У большасці рэгіёнаў вобласці дзеці і падлеткі або ўвогуле не парушаюць закон, або там рэгіструецца толькі па адным такім выпадку.

І ўсё ж у сацыяльна небяспечным становішчы ў Прыдзвінскім краі знаходзіцца больш за 2,3 тысячы сем'яў. У іх выхоўваюцца каля 4 тысяч дзяцей.

Пракуратура вобласці, у сваю чаргу, заклапочана нізкім паказчыкам кампенсацыі бацькамі дзяржаўных выдаткаў на ўтрыманне дзяцей — 54%. Будзе актывізаваная праца і ў гэтым кірунку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

ГАВАРЫЦЕ, ВАС СЛУХАЮЦЬ!

На прамую лінію да старшыні Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Сяргея АШМЯНЦАВА ў мінулую суботу дазваніўся 31 чалавек. Шэраг пытанняў, якія агучылі грамадзяне, датычыліся будаўніцтва жылля, працаўладкавання, медыцынскага абслугоўвання. Як заўсёды, былі пытанні па добраўпарадкаванні тэрыторый.

Жыхарка Баранавічаў крытыкавала работу камунальнікаў Паўднёвага мікрараёна горада. Жанчына сказала, што з вясны ў іх ні разу не прыбіралі двор, які зарастае травой і пустазеллем. Заяўніца лічыць, што прычына такога становішча заключаецца ў аптымізацыі штату ЖЭСаў. Сяргей Ашмянцаў адзначыў, што з-за скарачэння штатных адзінак у падраздзяленнях камунальнай гаспадаркі якасць добраўпарадкавання не павінна зніжацца. Аўтару звароту паабяцалі разабрацца з выездам на месца.

На адсутнасць камфорту скардзілася і брастаўчанка, якая пражывае па вуліцы Сунічнай, гэта мікрараён Бярозаўка. «У нас такая дарога, што вясной, восенню, асабліва калі дажджы, дзецям у школу нельга дабрацца: машыны едуць ушчыльную да агароджы. А яшчэ з 1 жніўня адмянілі прыпынак 6-й маршруткі. Аўтобусы №№10 і 11 ходзяць раз на гадзіну», — гаварыла жанчына. Старшыня аблсавета даручыў адпаведнай службе разабрацца з узнятай праблемай на гэтым тыдні, асабліва ў дачыненні да прыпынку маршрутнага таксі.

Быў званок таксама ад дзяўчыны-выпускніцы ВНУ, якая не можа знайсці работу, ад шматдзетнага бацькі, у якога ўзніклі праблемы з будаўніцтвам дома. Усе абаненты прамой лініі атрымаюць пісьмовыя адказы не пазней як праз 15 дзён ад дня звароту.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

ДЗЯКУЙ ЗА ПАМЯЦЬ

Не так даўно на тэрыторыі нашага Мілевіцкага сельсавета, дакладней — у Лёвічах, адбылося свята вёскі. Яно атрымалася вельмі рознабаковым: аддалі даніну памяці загінулым, адкрылі памятны знак, падрыхтавалі канцэртную праграму — пры гэтым аб'ядналі некалькі пакаленняў, паклікалі нават тых, хто не быў на Радзіме дзясятак-другі гадоў. Але аб усім па парадку.

У мінулым годзе падчас упарадкавання могілак Вольга Пятроўна Чопчыц прапанавала аднасяльчанам ушанаваць памяць сваякоў, загінулых у часы Вялікай Айчыннай вайны — тых, каго спалілі ў хляве 15 лютага 1943 года. Тым больш, што сярод загінулых былі яе дзед і яго сям'я... Вяскоўцы не засталіся абыякавымі. Грошы ахвяравалі хто колькі мог. У выніку побач з могілкамі быў адкрыты манумент памяці, з'явілася лампадка і шыльдачка, куды пайменна ўпісалі прозвішчы ўсіх загінулых мірных жыхароў вёскі Лёвічы.

Людскі паток быў падобны да руху невялікай рачулкі. Сярод прысутных быў і чалавек, які помніць той жудасны дзень і нават дапамагаў хаваць рэшткі чалавечых цел, спаленых карнікамі — Вольга Кірылаўна Катовіч. Яе шчымлівы расказ слухалі затаіўшы дыханне. Пазней айцец Дзмітрый асвяціў гэтае месца і правёў паніхіду.

Потым, на імправізаванай сцэне, упрыгожанай вышыўкамі, лялькамі, прадметамі хатняга ўжытку, пачалося прадстаўленне...

Свята працягвалася да поўначы. Былі песні, танцы, юшка, сустрэчы з далёкімі і блізкімі сваякамі. Вось так гісторыя маленькага куточка аб'яднала людзей, прымусіла паверыць, што агульнымі намаганнямі можна зрабіць многае. А ад сябе хочацца сказаць усім вяскоўцам вялікі дзякуй, пажадаць доўгага жыцця, цярпення і вытрымкі.

Тамара ТРАФІМОВІЧ,
кіраўнік спраў Мілевіцкага сельвыканкама
Жыткавіцкага раёна.

ТЭРЫТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ

АГУЛЬНАЕ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ НІЧЫЁ

Хто клапоціцца пра раён па ўласнай ініцыятыве?

Здаўна так павялося, што ўсе маштабныя задачы ў невялікіх населеных пунктах вырашаліся талакой. У многіх вёсках гэтыя традыцыі захаваліся і па сённяшні дзень. А вось у гарадах, асабліва буйных, суседзі часта не гатовыя і словам адзін з адным перакінуцца, не кажучы ўжо аб сумеснай працы. Аднак пакуль ёсць тыя, хто з усіх сіл супраціўляецца падобнай тэндэнцыі, сітуацыя не такая безнадзейная. Адзін з прыкладаў — камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, або КТГСы.

Хата не з краю

Гэта грамадскія аб'яднанні, члены якіх па ўласнай ініцыятыве, без аплаты, робяць усё магчымае, каб стварыць у сваім раёне як мага больш камфортныя ўмовы жыцця. У сталіцы, напрыклад, яны дзейнічаюць ужо больш за 20 гадоў, цяпер іх колькасць тут дасягае практычна паўтары сотні. Стварацца такія аб'яднанні ў Мінску пачалі, натхніўшыся прыкладам Масквы. Дарэчы, там іх дзейнасць лічыцца паўнавартаснай працай, за якую супрацоўнікі атрымліваюць грошы. У нас жа членамі арганізацыі кіруе не імкненне зарабіць, а жаданне жыць лепш.

Першапраходцам па ўкараненні гэтага наваўвядзення стаў Фрунзенскі раён. Тут жа, у мікрараёне Каменная Горка-1, знаходзіцца і КТГС №128, праўда, яго можна назваць яшчэ маладым — яму ўсяго шэсць гадоў. Увесь гэты час арганізацыяй кіруе **Аляксандр Уладзіміравіч НЕТУК** — чалавек энергічны, які не прывык прыкрывацца фразай «мая хата з краю». Грамадзянская актыўнасць абумоўлена багатым жыццёвым вопытам: у мужчыны дзве вышэйшыя адукацыі (інжынерная і педагагічная), за плячыма вайна ў Афганістане, праца ў сістэмах энергетыкі, будаўніцтва і ЖКГ. А вось да тэмы тэрытарыяльнага самакіравання ён прыйшоў практычна выпадкова. Стаў загадчыкам кааператыва ў сваім жа доме, абавязкі выконваў не фармальна, а адказна. За ўвесь час толькі ў адным шматпавярховіку ўдалося вырашыць больш за дзвесце праблем. Аляксандра заўважылі і прапанавалі пашырыць «зону» актыўнасці: арганізаваць у мікрараёне, які толькі зараджаўся, КТГС. У выніку арганізацыя неаднойчы станавілася найлепшай па розных паказчыках не толькі ў раёне, але і ў горадзе.

Мікрараён Каменная Горка–1.

На самай справе далучыцца да работ камітэта можа любы неабыякавы мясцовы жыхар. Праўда, звяртаюцца сюды часцей за ўсё старэйшыя па доме, пад'ездзе, старшыні кааператываў. Добра, калі яны па «сарафанным радыё» перадаюць інфармацыю далей. Знайсці звесткі аб камітэтах можна на сайце адміністрацыі раёна.

Ні больш ні менш

У полі зроку членаў арганізацыі вялікая колькасць праблем: ад замены лямпачкі ў пад'ездзе да арганізацыі масавых мерапрыемстваў. І ўсё ж асноўная ўвага прыпадае на абслугоўванне жылога фонду. Аляксандр Нетук прызнаецца, што пасля з'яўлення кантакт-цэнтра ЖКГ задачы крыху спрасціліся. Але гэта датычыцца толькі праблем, якія не патрабуюць неадкладнага ўмяшання. У экстранных выпадках прысутнасць пасрэднікай структуры толькі тармозіць працэс.

У сваёй працы старшыня камітэта раўняецца ні больш ні менш на Еўропу, дзе падобныя арганізацыі — рухаючая сіла ў вырашэнні многіх тэрытарыяльных пытанняў.

— Я заўсёды на сувязі, нават падчас адпачынку. Калі быць даступным толькі ў дні прыёму, толку не будзе, — адзначыў Аляксандр Нетук. Ужо некалькі гадоў ён спрабуе знайсці месца, дзе можна будзе праводзіць агульныя сходы, бо свайго памяшкання, акрамя кабінета, дзе раз на тыдзень праходзіць прыём, у камітэта няма. Вуліца для такіх задач, натуральна, не падыходзіць. Як варыянт — актавая зала ў школе, праўда, за яе арэнду неабходна заплаціць, а зрабіць гэта арганізацыі, у якой няма артыкулаў даходаў, вельмі цяжка.

> Стварацца такія аб'яднанні ў Мінску пачалі, натхніўшыся прыкладам Масквы. Дарэчы, там іх дзейнасць лічыцца паўнавартаснай працай, за якую супрацоўнікі атрымліваюць грошы.

У цэлым штодзённыя тэмы правільнага размяшчэння пешаходных дарожак, бяспекі дзіцячых пляцовак, вывазу смецця, чысціні пад'ездаў паступова ператвараюцца ў руціну, спраўляцца з якой — прывычная рэч. Зараз у цэнтры ўвагі Аляксандра Уладзіміравіча больш глабальныя пытанні, у прыватнасці «Закон аб зваротах грамадзян». Падрыхтаваны шэраг прапаноў па яго дапрацоўцы, паколькі сёння зварот у пэўную арганізацыю не абавязкова цягне за сабой адказ менавіта ад яе. Зварот можа пераадрасоўвацца некалькі разоў, што, па-першае, відавочна не паскарае працэс, а па-другое, не гарантуе рашэння.

Правільны рух

Не так даўно мікрараён Каменная Горка-1 стаў героем навін у СМІ. Прычына ў абмеркаванні будаўніцтва скразной чатырохпалоснай дарогі, якая будзе весці да буйнога гандлёвага цэнтра наўпрост праз дваровую тэрыторыю.

— За два гады мы напісалі больш за дзесяць зваротаў, дайшлі да Дзяржстандарта! — тлумачыць нерацыянальнасць такога рашэння з прафесійнага пункту гледжання член КГТС, архітэктар Рыгор Пінчук. — Там жа дзеці гуляюць! Цяпер чакаем канчатковага рашэння.

Яшчэ адзін галаўны боль арганізацыі — паркоўкі. Машыны, пакінутыя на зялёнай зоне, заносяцца ў спецыяльную базу. Аляксандр Уладзіміравіч прызнаецца, што не можа з абыякавасцю глядзець на тое, як руйнуюць плады яго працы, знішчаючы ўласнаручна высаджаныя клумбы. Калі з парушальнікамі не ўдаецца дамовіцца падобрасуседску, ён гатовы і ў Дзяржаўтаінспекцыю патэлефанаваць. Бо самакіраванне — гэта далёка не сінонім усёдазволенасці.

Але дзе паркавацца? Месцы сапраўды ў дэфіцыце, бо забудоўшчыкі імкнуцца загрузіць тэрыторыю па максімуме. Як варыянт — падземны паркінг, дзе адно месца будзе каштаваць каля 20 тысяч долараў. Зразумела, такі варыянт у доме не эліт-най забудовы не задавальняе практычна нікога. Пагаворваюць, што ў будучыні маштабны парковачны цэнтр можа з'явіцца ўздоўж кальцавой. Але зрухаў пакуль няма. Нават у такім маладым раёне, як Каменная Горка, вырашыць пытанне амаль немагчыма: уся тэрыторыя размеркаваная пад будучае будаўніцтва, кожны ўчастак улічаны. Атрымліваецца, праблема значна глыбейшая, паўплываць на яе можна толькі на заканадаўчым узроўні. І ў старшыні камітэта ёсць сваё меркаванне наконт гэтага:

— Неабходна адмяняць нарматывы 30-гадовай даўніны, калі машына была яшчэ прадметам раскошы. Паркоўкі трэба будаваць з разліку як мінімум адно месца для кожнай кватэры.

Так што члены камітэта бяруцца за вырашэнне любога пытання, бо сваім умоўным дэвізам лічаць фразу: «А хто, калі не мы?»

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

Извещение о повторном аукционе 28 августа 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех»	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями
Номер лота	1	2	3	4
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11П
Тип помещения	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Отдельно стоящее
Общая площадь (кв. м)	3982,2	4516,7	3351,5	539,0
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	1,444		3,574	
Начальная цена продажи	206 828,90	234 471,39	230 554,37	67 418,89
Сумма задатка	20 682,90	23 447,15	23 055,45	6 741,89
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г.	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г.	Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие 1876 м² , бетонное покрытие 2751 м², линия электропередач (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию 1972 г.	Одноэтажное здание. Канализационная сеть 73 м, водопроводная сеть 20,4 м, бетонное покрытие 701 м². Ввод в эксплуатацию – 1992 г.

Организатор аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»
Продавец аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»

Аукцион состоится **28 августа 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» BY16BAPB30124701200210000000 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление BAPBBY21401, УНП 200305504 , срок внесения суммы задатка – по 25 августа 2017 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 25 августа 2017 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375-44-545-77-21.

МЕРКАВАННІ

ЧАГО НЕ ХАПАЕ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ МАЛОГА БІЗНЕСУ Ў РЭГІЁНАХ?

З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія маюць непасрэднае дачыненне да гэтай сферы.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ:

— Малому і сярэдняму бізнесу не хапае росту даходаў насельніцтва і прадпрыемстваў і, адпаведна, попыту на прадукцыю і паслугі. Таксама не хапае нізкіх ставак па крэдытах і стабільнасці заканадаўства, ліквідацыі залішніх патрабаванняў да бізнесу. Акрамя таго, няма пазітыўнага стаўлення да прадпрымальнікаў з боку насельніцтва, органаў улады, сродкаў масавай інфармацыі. Імідж прадпрымальніцтва ў нас не вельмі пазітыўны, асабліва ў некаторых рэгіёнах. Раней бізнес ствараліў першую чаргу ў сферы гандлю і паслуг, таму людзі лічаць, што гэта нейкія шалёныя грошы, якія падаюць з неба. Гэта няпраўда, бо прадпрымальнік — той, хто ўкладае грошы на сваю рызыку, не спіць начамі і нясе адказнасць за свае дзеянні.

Зараз у адпаведным дэкрэце спрабуюць аптымізаваць залішнія патрабаванні да бізнесу... З іншага боку, у нас няма бандытызму і розных адхіленняў, таму я думаю, што калі будуць расці даходы насельніцтва, а комплекс па паляпшэнні ўмоў для вядзення бізнесу будзе прыняты, то мы павінны перайсці да росту колькасці малых і сярэдніх прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў. Акрамя таго, адсутнічаюць крэатыўныя ідэі і вопыт у канкурэнтнай барацьбе, у тым ліку — на знешнім рынку, а яшчэ не хапае большай юрыдычнай падтрымкі прадпрымальніцтва. Неабходна больш шырока прымяняць сучасныя тэхналогіі продажаў, работы з банкамі і кліентамі. І нам, вядома, не хапае традыцыйпрадпрымальніцтва, якія ў заходніх краінах фарміраваліся на працягу пакаленняў.

Старшыня Тураўскага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргей СКАРАПАЦКІ:

— На мой погляд, трэба пачынаць з сябе. Растлумачу: я лічу, што ў нас няшмат ініцыятыўных людзей, якія хочуць нешта стварыць або адкрыць. Да мяне не так часта звяртаюцца па пытаннях прадпрымальніцтва, людзі рэдка прыходзяць і кажуць, што ў іх ёсць запатрабаваны кірунак і яго трэба рэалізаваць. Але сёння ў грамадзян не так шмат грошай, каб аплачваць пэўныя паслугі прадпрымальнікаў. А ў бізнесе галоўнае — прадаць паслугу і атрымаць грошы.

Старшыня Прыснянскага сельскага выканаўчага камітэта Веткаўскага раёна Леанід КСЕНЗАЎ:

— На тэрыторыі нашага сельсавета няма ні малога, ні сярэдняга бізнесу наогул. Чаму? Таму што людзі лічаць, што ім гэта не пад сілу. Каб бізнес прыйшоў у глыбінку, трэба жаданне саміх вяскоўцаў. Акрамя таго, неабходны стартавы фінансавы капітал, але ж калі ў людзей невялікія заробкі, то адкуль яму ўзяцца? А калі ўзяць крэдыт, то аддаваць яго прыйдзецца вельмі доўгі час. Пакуль гэта нявыгадна. Вядома, нам бы не перашкодзілі бізнесмены ў нашым сельсавеце, бо многія памяшканні, якія яны могуць арандаваць і выкарыстоўваць для сваёй справы, стаяць пустыя. Напрыклад, можна адкрыць пункт, дзе шылі б вопратку, чынілі абутак, мэблю, тэхніку. Гэта сапраўды карысталася б попытам у нашых людзей.

Дырэктар «Гасціннага двара Няхачава» (Івацэвіцкі раён) Сяргей ЯЦЫНА:

— Наш народ прывык працаваць з 8 гадзін раніцы і да 5 гадзін вечара, а трэба быць гатовым працаваць па 24 гадзіны на суткі. І наогул павінны быць спецыялісты менавіта ў сваёй справе і галіне. Не павінен інжынер кіраваць рэстаранам — гэта дакладна. Трэба мяняць такое становішча спраў. Дзяржава не перашкаджае развіццю малога і сярэдняга бізнесу — і гэта галоўнае. У бізнесменаў ёсць нейкія цяжкасці, але ж гэта, як той казаў, нашы праблемы, якія мы самі павінны вырашыць. Дзяржава не можа ўдзельнічаць наогул ва ўсім. Яна дала дарогу, а далей ты сам па сабе.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

МАЛЕНЬКАМУ КАРАБЛЮ — ВЯЛІКАЕ ПЛАВАННЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Лічбы кажуць самі за сябе. Выручка малых і мікрапрадпрыемстваў у 2016 годзе склала 98,4 трлн рублёў, у той час як у 2015-м — 888,7 трлн рублёў. Іх колькасць паменшылася з 111 792 у 2014-м да 105 067 у мінулым годзе. Прытым стабільна высокай застаецца колькасць задзейнічаных тут работнікаў — ад 762 да 846 тысяч чалавек, амаль дзясятая частка ад усяго насельніцтва Беларусі. Вядома, што стварэнне бізнесу — заўжды рызыка. І чым яна большая, тым больш шанцаў, што ў выніку бізнесмен атрымае буйны прыбытак ад укладзеных сродкаў. Ці апраўданая яна для тых, хто вырашыць пачаць уласную справу ў Беларусі?

«І швец і жнец і на дудзе ігрэц»

З якімі выклікамі сёння даводзіцца сустрэцца таму, хто вырашыў арганізаваць малы бізнес у нашай краіне? Па словах **Віктара МАРГЕЛАВА, сустаршыні Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, члена Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь,** бізнесмены лічаць, што сёння існуюць праблемы базавых умоў. Без паляпшэння ў гэтым кірунку размаўляць пра далейшае развіццё бізнесу ўвогуле немагчыма. «Гэта праблемы няроўных умоў гаспадарання, неплацяжоў у адрас суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, пытанні ўласнасці, судовай практыкі. Астатнія носяць больш лакальны характар», — удакладняе ён.

> «Эксперты і бізнесмены павінны мець голас партнёра, а не толькі кансультанта, да якога звяртаюцца, калі спатрэбіцца».

Асаблівасць вядзення малога бізнесу заключаецца ў тым, што стабільнасці і прадказальнасці ў рабоце такіх арганізацый нашмат менш. «У той час як буйныя кампаніі — гэта вялікія караблі, малыя плывуць, нібыта ў маленькай лодцы. Таму любая хваля на вадзе для іх адчуваецца найбольш востра. У сувязі з гэтым удзельныя выдаткі малых прадпрыемстваў у сабекошце вышэйшыя, чым у вялікіх. Пытанне толькі ў тым, што вялікія не здольныя гнутка запаўняць малыя рынкавыя нішы, якія з'яўляюцца ў эканоміцы», — канстатуе Віктар Маргелаў.

Таксама адзін з адмоўных фактараў датычыцца найму людзей. У малых прадпрыемстваў няма такога паняцця, як жорсткія функцыянальныя вытворчыя абавязкі: сёння дырэктар можа выконваць сваю працу, а заўтра быць і маркетолагам, і грузчыкам. А калі на работу не выйшла прыбіральшчыца, то давядзецца пашчыраваць і за яе. На вялікім прадпрыемстве такога, як правіла, не адбываецца. Таму патрабаванні да персаналу малых прадпрыемстваў вышэйшыя, бо там патрэбны ўніверсальныя людзі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Разумна падзяліць эканамічную «коўдру»

Рост ці падзенне колькасці малых прадпрыемстваў залежыць ад рынкавых законаў, упэўнены член Савета па развіцці прадпрымальніцтва. Напрыклад, попыт нараджае прапанову. Пакуль быў попыт на пашырэнне эканамічнай дзейнасці ў нашай краіне, расла і колькасць малых прадпрыемстваў, і колькасць занятых у гэтай сферы. «Як толькі эканоміка пачала запавольвацца ў сваім развіцці, то адбылося пераразмеркаванне эканамічнай «коўдры». Асабліва гэта стала відавочна ў будаўніцтве — паміж дзяржаўнымі і прыватнымі кампаніямі», — удакладняе Віктар Маргелаў.

Вырашэнне гэтай праблемы — комплексны падыход, згодна з якім варта ўраўняць ва ўмовах вядзення справы прыватнае прадпрымальніцтва і дзяржаўнае. «Без дзялення рынкавай прасторы трэба вызначыцца, каму на чым варта рабіць акцэнт, — кажа сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва. — Напрыклад, у сталіцы катастрафічна не хапае дзіцячых садкоў. Чаму іх ніхто не будуе? Дзяржава ўзводзіць іх згодна з планам. Чаму б прадпрымальнікам не далучыцца да гэтага? Таму тут патрэбна адзіная стратэгія — як, хто і што робіць, а затым — прадаваць. Бо малое прадпрымальніцтва не можа існаваць асобна. Яно выжывае толькі аб'ядноўваючыся ў сістэмы — кластары, — і тады яны становяцца канкурэнтаздольнымі».

Па словах эксперта, умоў, у тым ліку заканадаўчых, для гэтага пакуль няма, хоць адпаведныя крокі дзяржавай ужо робяцца. Менавіта гэты кірунак найбольш перспектыўны ў плане развіцця бізнесу. «У далейшым варта фарміраваць у краіне стратэгію малога прадпрымальніцтва, а таксама звярнуць увагу на стварэнне іншых, больш лакальных дакументаў. Тады можна будзе казаць пра аднаўленне яго долі ў ВУП краіны і нават павышаць гэты паказчык», — лічыць Віктар Маргелаў.

Патрэбна платформа для дыялогу

Па словах **эканаміста Яраслава РАМАНЧУКА, кіраўніка навукова-даследчага цэнтра МІЭЭСА,** у пяцёрцы найбольш балючых для малога бізнесу пытанняў — высокая падатковая нагрузка, складанае падатковае адміністраванне, нестабільнае заканадаўства (як вынік — няўпэўненасць у заўтрашнім дні для сваёй справы), таргі і крэдыты, няроўныя ўмовы гаспадарання. На яго думку, у бізнес-супольнасці ёсць канкрэтныя прапановы, як можна вырашыць кожнае з іх. Яны занатаваны ў Нацыянальнай платформе бізнесу Беларусі.

«Але пакуль адсутнічае пастаянная пляцоўка для дыялогу паміж бізнесам і ўладай, — лічыць эксперт. — Бізнес-супольнасць прапаноўвае для гэтага ўвесці пасаду амбудсмена ці актывізаваць работу Савета па развіцці прадпрымальніцтва, створанага пры Прэзідэнце, але склад яго, паўнамоцтвы, голас у прыняцці рашэнняў павінны быць іншымі. Эксперты і бізнесмены павінны мець голас партнёра, а не толькі кансультанта, да якога звяртаюцца, калі спатрэбіцца».

Твой найлепшы бізнес

Калі чалавек, нягледзячы на ўсе перапоны, усё ж такі адважыўся пачаць уласную справу, то тут найлепшы варыянт — выбраць тую нішу, у якой ён найбольш дасведчаны і кампетэнтны. «Калі мае ён чымсьці дастатковы досвед — займайцеся менавіта гэтым, — раіць **Аляксандр КАНДРАШОНАК, намеснік дырэктара Агенцтва стратэгічнага і эканамічнага развіцця.** — Галоўная памылка бізнесменаў-пачаткоўцаў — калі яны выбіраюць нішы, якія лічаць перспектыўнымі, але нічога ў гэтым не разумеюць. Апякаюцца і расчароўваюцца ў стварэнні ўласнай справы. Самы лепшы той бізнес, у якім разбіраешся».

Пры гэтым не сакрэт, што ўласную справу лепей арганізоўваць так, каб яна была арыентаваная не толькі на ўнутраны беларускі рынак, але і на замежны. Калі казаць пра малы бізнес, на думку Аляксандра Кандрашонка, тут зараз найбольш перспектыўныя кірункі — інфармацыйныя тэхналогіі і сельская гаспадарка.

Што датычыцца сельскай гаспадаркі, то неабавязкова займацца жывёлагадоўляй, у якой цяжка канкурыраваць з буйнымі арганізацыямі. Ёсць і іншыя нішы гэтага рынку, якія пакуль менш занятыя. Напрыклад, вырошчванне ягад і агародніны. Цяпер павялічваецца колькасць праектаў, якія накіраваны на вырошчванне маліны і буякоў. Сёння беларускія плады і ягады імпартуюцца ў краіны Еўропы, і там іх ахвотна набываюць.

«Тым больш дзяржава падтрымлівае такія пачынанні, таму дае і зямлю, і дадатковае льготнае фінансаванне. Галоўнае — на такую прадукцыю зараз ёсць попыт. А значыць, яна не застанецца на складзе. Акрамя таго, цяпер папулярнай становіцца экалагічна чыстая прадукцыя, якую таксама можна вырабляць у Беларусі», — кажа Аляксандр Кандрашонак.

«Аддавацца па поўнай»

Неблагой ідэяй можа стаць стварэнне вытворчасці па вырабе аўтарскіх рэчаў, арыентаваных на масавага спажыўца. «Напрыклад, гэта можа быць выраб рэчаў са скуры, тых жа сумак. Яны атрымліваюцца таннейшыя, іх ахвотна набываюць. Так ствараюцца брэнды, прадукцыя якіх пачынае прадавацца і за мяжу», — лічыць Аляксандр Кандрашонак.

Таксама сярод распаўсюджаных памылак бізнесменаў-пачаткоўцаў намеснік дырэктара агенцтва называе арыентацыю на занадта шырокі маштаб уласнай справы. «Ёсць «ідэя фікс» рабіць адразу вялікі праект, забываючыся пра тое, што развіваць бізнес варта паэтапна. Лепш пачынаць з малога прадпрыемства, паглядзець рынак, засвоіць яго і толькі пасля ўзбуйняцца», — тлумачыць ён. Прытым арганізаваць вытворчасць не так складана, як адшукаць, якім чынам збыць прадукцыю. Трэба пралічыць, ці змогуць акупіцца ўкладзеныя ў справу сродкі. Таксама часта чалавек не можа вызначыцца, хто ён: прадпрымальнік ці наёмны работнік? Людзі, не пакідаючы асноўнага месца працы, імкнуцца стварыць уласную справу. «Але так не бывае. Для таго, каб бізнес працаваў, яму трэба аддавацца па поўнай», — упэўнены Аляксандр Кандрашонак.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

УЛАСНЫ ВОПЫТ

УВАГА: прыватны вадаём!

З чым сутыкаецца арандатар на рыбаводным промысле

ГРОДЗЕНЕЦ Сяргей ЧАРНЯК кожны год бярэ ў арэнду па возеры. Зараз іх ужо тры. Але паўсюдна навесці парадак не ўдаецца. Мясцовыя жыхары не задаволеныя платнай рыбалкай і часта парушаюць правілы.

Пачысцілі і прыбралі

Новы кірунак сваёй дзейнасці бізнесмен Сяргей Чарняк пачаў з даволі значнага па плошчы вадаёма каля вёскі Плавы, што ў Гродзенскім раёне. Аб'ект дастаўся не самы лепшы — вадаём быў задзейнічаны ў сістэме адтока са свінаводчага комплексу мясцовага СВК. У возеры збіралася вада, а ў сажалцы, якая знаходзілася побач, яна змешвалася з арганікай і паступала на палі...

Паколькі паразумення знайсці не ўдалося, гаспадар збіраецца пайсці на крайнія меры: восенню вадаём спусцяць, а рыбу перавязуць у іншае возера альбо рэалізуюць.

Перш-наперш новы ўладальнік адрамантаваў вароты дамбы, каб не было аварыйных выкідаў. Потым спусціў вадаём і пачысціў. Тое ж адбылося з прыбярэжнай зонай, адкуль вывезлі каля дваццаці МАЗаў смецця. Зараз па ўсёй берагавой лініі ўстаноўлена каля сотні пафарбаваных у зялёны колер металічных ёмістасцяў для адходаў. Яны вывозяцца кожны тыдзень.

Для тых, хто толькі пачынае гэту справу, Сяргей раіць набыць неабходныя інструменты для навядзення парадку — пілу, касілку, грузавік. І ў першую чаргу добраўпарадкаваць тэрыторыю. Па магчымасці правесці электрычнасць. Для таго, каб атрымаць адданчу, неабходна ўкласці каля 10 тыс. долараў. Палова гэтых сродкаў патрэбна, каб зарыбіць вадаём. Частка — на зону адпачынку.

Пакуль альтанка, потым — летні домік

Роўна год спатрэбіўся бізнесмену, каб навесці парадак. Зараз тут тры зоны для адпачынку, агароджаныя драўляным плотам. Ён зроблены з доўгіх дошак, але такім чынам, што на гэта не спатрэбілася ніводнага цвіка. У кожнай зоне стаіць альтанка, адведзена месца для вогнішча. Для мангалаў нарыхтаваны дровы.

Сяргей Чарняк кажа, што ў выхадныя тут бывае больш за сто чалавек. Пры гэтым кошт за адну зону адпачынку з альтанкай у суткі складае 15 рублёў, у выхадныя — 25. З кожным годам расце папулярнасць выездаў на прыроду, таму бізнесмен на другі год плануе паставіць чатыры каркасныя летнія домікі на палях, кожны на дзве сям'і. У стадыі распрацоўкі праект па будаўніцтве аграсядзібы, пад яе ў аграрагарадку выдзелены ўчастак.

— Некаторыя ўстанаўліваюць завоблачную цану на такія паслугі, а гэта немэтазгодна, — лічыць Сяргей Чарняк, — лепш нарошчваць прыбытак за кошт аб'ёму. Вядома, трэба і ўкласці напачатку. Напрыклад, зона адпачынку мне абышлася ў тры тысячы долараў, але ўсё гэта акупляецца, бо сюды прыязджаюць ажно да глыбокай восені.

«Сумленная» рыбалка

Сяргей Чарняк сам заядлы рыбак, таму і правілы на сваім вадаёме ўстанавіў дэмакратычныя. Уваходны білет каштуе 3 рублі. Кошт рыбы вызначаецца па факце. Напрыклад, карась — 2 рублі за кілаграм, карп — 3,5 рубля. Гэта значна танней, чым у рознічным гандлі, кажа арандатар. Сродкі ідуць на тое, каб падтрымліваць належны стан прыбярэжнай зоны, вывозіць смецце.

Некаторыя арандатары бяруць па 15—16 рублёў за месца, куды ўваходзіць і кошт рыбы. Але ж ёсць нямала аматараў, якія прыязджаюць парыбачыць дзеля спартыўнага інтарэсу. Увесь улоў яны адпускаюць (бывае, што вага рыбы даходзіць да 20 кг). Такім рыбакам, безумоўна, важна, каб кошт білета не залежаў ад улову.

Каб рыбакам было зручна лавіць, Сяргей Чарняк мяркуе пабудаваць некалькі пірсаў. Але і зараз падыход да вады добра вызначаны. Бераг пастаянна абкошваецца. Праз 40—50 м стаяць сметнікі. Для бізнесмена важна, каб яго возера не толькі карысталася папулярнасцю ў рыбакоў, але і было найлепшым у акаліцы па санітарным стане і добраўпарадкаванні.

> У Гродзенскай вобласці 270 рыбаводных вадаёмаў сярэдняй плошчай 11 га. З іх 160 — у арэндзе.

У Абухаўскім сельскім Савеце, на тэрыторыі якога знаходзіцца вадаём, прыватным уладальнікам задаволены. Тут лічаць, што аб'ект набыў добрага гаспадара. Умовы рыбалкі таксама не выклікаюць нараканняў. Прыклад таму — чэмпіянаты па рыбнай лоўлі, у тым ліку абласныя, якія арганізуе рыбалоўны клуб. А такія мерапрыемствы праходзяць толькі на самых лепшых вадаёмах.

А жыхары — супраць

Нядаўна бізнесмен узяў у арэнду невялічкі вадаём каля вёскі Яскевічы, таксама ў Гродзенскім раёне, каб арганізаваць тут платную рыбалку. Як і ў першым выпадку, пачысціў ад смецця, адрамантаваў гідратэхнічнае збудаванне.

Возера знаходзіцца за кіламетраў 20 ад Гродна, як і першы арандаваны вадаём, але ў іншым баку. Кожны ранак і вечар Сяргей аб'язджае іх, каб сачыць за парадкам. Яго асабліва непакоіць, што на новым возеры вельмі часта здараюцца выпадкі браканьерства, хоць устаноўлены таблічкі з папярэджаннем, а дарога да вадаёма перакрыта шлагбаумам.

— Пакуль рыбалка тут забаронена, — тлумачыць Сяргей. — Мы нядаўна запусцілі сюды малькоў карпа. Я прасіў мясцовых жыхароў, каб яны пачакалі, пакуль рыба падрасце, і тады тут можна будзе на платнай аснове рыбачыць.

Сяргей ЧАРНЯК сваім бізнесам задаволены.

Але яны не слухаюць. Складзена шмат адміністрацыйных пратаколаў, але амаль кожны дзень знаходзяцца парушальнікі. Участковы таксама ўсіх не можа ўпільнаваць.

Паколькі паразумення знайсці не ўдалося, гаспадар збіраецца пайсці на крайнія меры: восенню вадаём спусцяць, а рыбу перавязуць у іншае возера альбо рэалізуюць. У далейшым тут плануецца вырошчваць белага амура і таўсталобіка, якія не клююць на вуду. А за лоўлю сеткай ці іншымі прыладамі прадугледжана не толькі адміністрацыйная, але і крымінальная адказнасць, заўважае Сяргей Чарняк. Ён збіраецца сачыць за гэтым асабліва пільна.

Дарэчы, апошнім часам здараецца нямала выпадкаў, калі арандатары адмаўляюцца ад арэнды вадаёма менавіта з-за агрэсіўных паводзін мясцовых жыхароў, паведамілі ў абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні. У год колькасць такіх выпадкаў дасягае дзясятка.

Выгадная справа

Некаторыя арандатары не ведаюць, як правільна арганізаваць работу, таму і церпяць страты. Адмаўляцца ад свайго кірунку Сяргей не збіраецца. Па-першае, многа ўкладзена, а па-другое, справа гэта пры правільным падыходзе прыбытковая. Сёлета Сяргей плануе заняцца больш шырока рэалізацыяй рыбы. У Гродзенскім райвыканкаме бізнесмена падтрымалі і выдзелілі яму некалькі месцаў для продажу ў аграрагарадках і горадзе Скідзелі. Для гэтых мэт закуплены ізатэрмічныя ёмістасці на 1 тону рыбы, кіслародныя балоны. Выязны гандаль пачнецца бліжэй да восені.

Зараз Сяргей арандуе тры вадаёмы ў Гродзенскім раёне агульнай плошчай 25 га. Ён не супраць павялічыць сваю водную гаспадарку.

— У мяне і брата падрастаюць дзеці, будзе і для іх справа, — разважае Сяргей.

Сам ён родам з вёскі і ўсяго дабіўся менавіта працай. Зараз у яго ёсць яшчэ і фруктовы бізнес, таксама ён займаецца перавозкамі. Падключыцца ж да «воднай» тэмы прапанавалі мясцовыя ўлады. Агульны працэнт прыватных вадаёмаў невялікі, а парадак наводзіць трэба.

— Я максімаліст, — робіць вывад бізнесмен, — калі пачынаю справу, абавязкова павінен бачыць вынік. Раблю для гэтага ўсё магчымае і разам з гэтым адчуваю падтрымку ад райвыканкама і яго старшыні Яна Васілеўскага. Тут шукаюць гаспадароў, здольных добраўпарадкаваць вадаёмы. А такіх азёраў і сажалак яшчэ даволі многа...

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

Ігар САРОКІН, намеснік старшыні камітэта сельскай гаспадаркі і харчавання Гродзенскага аблвыканкама:

— Зараз мы павінны правесці інвентарызацыю вадаёмаў — іх у нас больш за 100, распрацаваць комплексную схему водных угоддзяў, каб перадаць іх арандатарам. Трэба па максімуме прыцягваць сюды прыватны бізнес.

У значнай ступені гэты працэс стрымлівае негатыўнае стаўленне мясцовых жыхароў, якія вымушаны рыбачыць «па-новаму», за грошы. Гэта падабаецца далёка не ўсім. Але трэба разумець, што сапраўдны гаспадар зробіць усё магчымае, каб рыбы ў возеры ці вадаёме стала больш. І ўвогуле будзе наведзены парадак. Пакуль не вельмі запатрабаваныя вадаёмы, якія знаходзяцца ўдалечыні ад горада. Тыя, што паблізу, у асноўным маюць арандатараў.

БУДЗЬ У КУРСЕ!

РЫБАЧЫЦЬ ЦЯПЕР МОЖНА БЯСПЛАТНА

У Віцебскай і Гомельскай абласцях з арэнды выключаны 38 кіламетраў рэк. З 17 жніўня ў фонд запасу рыбалоўных угоддзяў пяройдзе ўчастак Дняпра.

Рыбалоўнымі ўгоддзямі фонду запасу сталі ўчасткі некаторых вадацёкаў, якія раней знаходзіліся ў падпарадкаванні арандатараў. Цяпер грамадзяне могуць рыбачыць там бясплатна, паведамілі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

У Браслаўскім раёне з арэнды выключаны 10 кіламетраў ракі Заходняя Дзвіна (у межах раёна), у Пастаўскім раёне — 5 кіламетраў ракі Страча (ад вытоку з возера Малыя Швакшты да моста каля вёскі Дуброўшчына), у Лоеўскім раёне — участак Дняпра працягласцю 10 кіламетраў (ад вёскі Каменка, лесасклада — уніз па цячэнні да вёскі Шчытцы).

З 17 жніўня ў фонд запасу рыбалоўных угоддзяў пяройдзе 13-кіламетровы ўчастак Дняпра ў Рэчыцкім раёне (ад газаправода, размешчанага за 500 метраў уверх па цячэнні ад населенага пункта Унорыца і ўніз па цячэнні да чыгуначнага моста).

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №247 ад 11.07.2017 вадацёкі ў арэнду выдавацца больш не будуць. З дзеючых дагавораў арэнды рэк арганізацыя платнага аматарскага рыбалоўства будзе выключана.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ГЭТА ПРАЦУЕ

Як ідэя становіцца бізнесам

Дэпутаты Савета Рэспублікі знаёмяцца з работай кампаніі «J.T.Support me».

Гомельскі тэхнапарк зараз — быццам масток паміж навуковай сферай і рэальным сектарам эканомікі, выдатная стартавая пляцоўка, дзе чалавек у максімальна камфортных умовах можа рэалізаваць свае інавацыйныя ідэі і распрацоўкі.

На плошчы звыш 4 тыс. квадратных метраў у Гомельскім тэхнапарку цяпер працуе 18 рэзідэнтаў. Гэта арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі. Усяго 245 чалавек. У 2016 годзе тут было створана 114 новых працоўных месцаў. Сёння запоўненасць памяшканняў парка складае амаль 100%.

Заснавальнікам Гомельскага тэхнапарка з'яўляецца аблвыканкам. Адсюль вынікае, што тэхнапарк — дзяржаўная арганізацыя, якая ўяўляе сабою класічную мадэль бізнес-інкубатара еўрапейскага ўзора. Ідэі, якія ўвасабляюць у жыццё рэзідэнты, магчыма, у будучыні стануць пунктамі росту эканомікі.

Тэхнапарк займаецца падтрымкай інавацыйных праектаў у розных сферах: мікраэлектроніка, прыборабудаванне і шэраг іншых кірункаў. І ўсё ж найбольш актыўна тут развіваецца ІТ-сегмент. Каля 50% рэзідэнтаў Гомельскага тэхнапарка занятыя ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Сярод іх ёсць тыя, хто працуе на ўнутраны рынак, і тыя, хто накіраваны на экспарт.

Геаграфія экспарту рэзідэнтаў за час існавання парка ўключала: Вялікабрытанію, Ганконг, Італію, Літву, Малайзію, Польшчу, Расію, Славакію, ЗША, Тайвань, Турцыю, Украіну, Чылі, Паўднёвую Карэю. Статус рэзідэнта могуць атрымаць стартапы, або кампаніі, якія ўжо працуюць на рынку, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. Максімальны тэрмін для рэалізацыі праекта — шэсць гадоў. Калі ідэя аказваецца вартай, то кампанія ці бізнесмен адпраўляецца ў вольнае плаванне. У выпадку правалу — пакідае сцены інкубатара. Па сусветнай статыстыцы, са 100% тых, хто рызыкнуў стварыць прыватную справу ў тэхнапарку, выжывае каля 80.

Дасягнутыя поспехі і вынікі можна ацаніць лічбамі. Як расказала **памочнік дырэктара ААТ «Гомельскі тэхнапарк» Алена МЯЛЕШКА,** па выніках работы за першае паўгоддзе 2017-га рэзідэнтамі экспартавана прадукцыі і паслуг на суму 2 136,91 тыс. руб. За паўгоддзе рэзідэнты, выплаціўшы падаткі, зборы і плацяжы, папоўнілі дзяржаўную казну на 912,86 тыс. руб.

Між тым дзейнасць Гомельскага тэхнапарка не абмяжоўваецца работай з яго рэзідэнтамі ў сценах будынка. Існуе мноства ідэй і праектаў. Напрыклад, плануецца спецыяльна для школьнікаў арганізаваць тэхнічныя цэнтры, гурткі, каб такім чынам стымуляваць займацца дакладнымі навукамі: матэматыкай, хіміяй, фізікай.

Развіваецца і супрацоўніцтва Гомельскага тэхнапарка з Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф. Скарыны і Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам імя П. В. Сухога. На пастаяннай аснове студэнты гэтых ВНУ праходзяць вытворчую і пераддыпломную практыку ў кампаніях-рэзідэнтах. Дарэчы, навучальныя ўстановы выказваюць гатоўнасць карэктаваць вучэбныя праграмы выходзячы з запатрабаванняў магчымых работадаўцаў. Акрамя таго, кампаніі-рэзідэнты арганізуюць для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэтаў курсы ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

СВАЯ СПРАВА

«ВЕНЕРА» Ў ДАЛОНЯХ

Трымаць у далонях «Зорку Венеру»— звычайная справа для сямейнай пары з вёскі Карнюткі Валожынскага раёна. Мыла з такой назвай выпускае кампанія «Шляхетныя вырабы» пад брэндам «Каралі». Ранейшы сямейны бізнес ужо перарос у невялікую вытворчасць, а распаўсюджванне беларускай культуры стала сэнсам усёй справы.

Цяпер тут выпускаюць мыла і вырабы з фарфору. Ідэя прадукцыі — развіваць гонар за сваю гісторыю і культуру. Як гэта рабіць? Па-першае, ствараць якасныя беларускія рэчы. Па-другое, укладваць у іх сэнс. Так, многія жанчыны, мабыць, жадаюць адчуць сябе прыгажуняй Барбарай Радзівіл, якую кахаў кароль Жыгімонт ІІ Аўгуст, нягледзячы на перашкоды сваякоў і рызыку страціць трон. А легенда пра Чорную панну Нясвіжа, якой стала Барбара пасля спроб вярнуць яе з таго свету, расказвае пра каханне без меж. Яна натхніла стварыць і духмянае мыла з такой назвай.

Віленскае барока таксама пакінула адметны след у архітэктуры Беларусі. Акрамя будынкаў у Вільні ў гэтым стылі створаны, напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку і сабор Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Глыбокім. І гэты напрамак таксама знайшоў адлюстраванне ў назвах прадуктаў серыі «Каралі». Яшчэ адзін прыклад — «Цуд на Каляды». Ці можа ён здзейсніць мару? Невядома. Але паспрабаваць варта.

— Мы падкрэсліваем, што ёсць пэўныя традыцыйныя каштоўнасці для беларусаў, якія мы хацелі б несці ў масы. Гэта ў першую чаргу для нас — каб памятаць сваю гісторыю, у другую чаргу — для турыстаў, якія знаёмяцца з нашай краінай, у тым ліку праз нашы прадукты, — расказвае **дырэктар кампаніі Сяргей СЕМЯНЮК.**

Мыла робяць невялікімі партыямі ўручную з раслінных алеяў. Ёсць і другі напрамак вытворчасці — фарфор. Яго выбралі невыпадкова: наборы з імбрыка, кубкаў, сподкаў, сальніцы, перачніцы, вазы і мыльніцы таксама звязаны з нашай культурай: на іх — выявы зброі часоў Вялікага Княства Літоўскага і выцінанак. «Мы шукалі нейкія з'явы беларускай гісторыі, вельмі характэрныя для беларусаў, якія павінны выклікаць пэўны гонар. І адпаведна ВКЛ — гэта адна са старонак гісторыі, якая можа выклікаць гэта пачуццё. Мы спрабавалі яе нейкім чынам праілюстраваць на нашых прадуктах», — тлумачыць суразмоўнік.

Месца пад Валожынам выбралі за прыгожыя краявіды і вельмі характэрную для Беларусі прыроду. Не так даўно набылі ва ўласнасць будынак былой школы. Ён яшчэ рэстаўрыруецца, і ў выніку там будуць знаходзіцца і вытворчасць, і працоўныя пакоі для рамеснікаў. А сам будынак стане сацыяльна-культурным аб'ектам — месцам прыцягнення для турыстаў з усёй Беларусі і замежнікаў. Суразмоўнік спадзяецца, што бізнес будзе пашырацца, а разам з гэтым створацца і новыя рабочыя месцы.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

За першае паўгоддзе ў Валожынскім раёне з'явілася 46 новых індывідуальных прадпрымальнікаў і зарэгістравана 18 новых юрыдычных асоб. Іх асноўны від дзейнасці — гандаль і аказанне паслуг. Увогуле, паводле статыстыкі, за першы квартал гэтага года ў раёне ўласным бізнесам займаюцца каля 530 ІП і 390 юрасоб.

Па словах **галоўнага спецыяліста аддзела эканомікі Валожынскага райвыканкама Ядвігі ТУМЕЛЬ,** з кожным годам колькасць прадпрымальнікаў павялічваецца. Працэс рэгістрацыі даволі просты: трэба падаць заяву і аплаціць дзяржпошліну. І ў той жа дзень бізнес будзе афіцыйна зарэгістраваны. Для беспрацоўных цэнтр занятасці выдзяляе бязвыплатныя субсідыі. Да таго ж у райвыканкаме можна атрымаць кансультацыю па юрыдычных аспектах адкрыцця сваёй справы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.

Продавец: Общество с ограниченной ответственностью «Полоцкая строительная компания», 211400 Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, д. 64, 8 (029) 219-07-93

Лот №1. Капитальное строение с инв. №250/С-43103 площадью 1039 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий район, г. Полоцк, ул. Суворова, 64, наименование – стоянка автотранспортная, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, на земельном участке с кадастровым номером 243500000005002005 площадью 0,1519 га. Составные части и принадлежности: стоянка автотранспортная. **Начальная цена:** 41 840 руб. без НДС. **Задаток:** 4 184 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 19.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах с 16.08.2017 с 8.30 по 18.09.2017 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY55BAPB30124514600120000000 в ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление г. Витебск, БИК BAPBBY22424, УНП 390455266. Получатель платежа: ООО «Полоцкая строительная компания». **Условие аукциона:** оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00.

Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: ОАО «Витебскоблавтотранс» (Филиал «Автотранспортное предприятие №18» г. Браслав»), 211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Юбилейная, 99, тел. (+37533)345-11-39

Лот №1. Капитальное строение с инв.№ 210/С-8858 по адресу: Витебская обл., Браславский район, г. Браслав, ул. Промышленная, 11, площадью 57,7 кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – автозаправочный пункт; капитальное строение с инв. №210/С-8859 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Промышленная, д. 11, площадью 306 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – открытая площадка для хранения горюче-смазочных материалов. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 220850100002000035 площадью 1,2160 га, назначение: земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в т. ч. автомобильных заправочных и газонаполнительных станций). **Начальная цена:** 62 392,50 без НДС. **Задаток:** 6 239,25 руб.

